Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 СТУДЗЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР № 12 (28376)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Як павінны чысціць дарогі**

СТАР. 3

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена



**Іх спыняе толькі шторм**



**Якое яно, пакаленне Z?**

*ЛІЧБА ДНЯ*

**291 млн пасажыраў**

*перавезла сталічная падземка ў 2016 годзе: штодня паслугамі Мінскага метрапалітэна карысталіся каля 800 тысяч чалавек. Удзельная вага метро ў гарадскіх перавозках сталічным пасажырскім транспартам дасягнула ў 2016 годзе 40,15%. У мінулым годзе па абедзвюх лініях метрапалітэна прайшло 416 103 цягнікі, у сярэднім за суткі — 1137 цягнікоў. Маскоўская лінія перавезла 168,5 млн пасажыраў — 57,9% пасажырапатоку, Аўтазаводская — 122,5 млн, або 42,1%. Лідары ў станцыйным спісе па пасажырапатоку захавалі свае пазіцыі: станцыі «Плошча Леніна» (61 тыс. пасажыраў за суткі), «Каменная Горка» (59,6 тыс.). Самыя «малалюдныя» станцыі — «Купалаўская» (5,9 тыс.) і «Першамайская» (8,5 тыс.). Праз турнікеты самай «маладой» станцыі Мінскага метро — «Малінаўкі» — кожныя суткі праходзілі 34,6 тыс. пасажыраў.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 19.01.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9439 ▼ |
| Еўра | 2,0778 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 |
| Укр. грыўня | 0,0707 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# СЯМЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчане Дзмітрый і Алена СВІРЫДЫ і дочкі Арына і Ксенія лепяць снежную бабу.

■ Напярэдадні

## ПАЧАТАК МІСІІ

### Дыпламатычная служба нашай краіны адкрыла новыя старонкі сваёй гісторыі



**У пятніцу, 20 студзеня, у Мінску па вуліцы Рэвалюцыйнай, 15, будзе ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка, якая засведчыць, што па гэтым адрасе ў студзені-лютым 1919 года размяшчаўся Камісарыят па замежных справах Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь — першая знешнепалітычная ўстанова дзяржавы. Факт, які дапоўніў гісторыю дыпламатычнай службы Беларусі, стаў вядомым дзякуючы нядаўна знойдзенай 98-гадовай публікацыі ў газеце «Звязда» (у 1919 годзе «Звезда»). Пра што яшчэ ўдалося даведацца са старых газетных публікацый, і якое гэта мае значэнне для гісторыі нашай краіны, мы распыталі кіраўніка Клуба ветэранаў Міністэрства замежных спраў Зою КАЛАНТАЙ, чалавека, які мае да знаходкі прамое дачыненне.**

***— Зоя Леанідаўна, раскажыце, якая работа папярэднічала вырабу гэтага памятнага знака?***

— Каля года назад у Міністэрстве замежных спраў Беларусі быў створаны Клуб ветэранаў. Амаль адразу мы заняліся вывучэннем архіўных матэрыялаў, якія датычацца знешнепалітычнага ведамства краіны. На жаль, у сілу шэрагу прычын дакументаў за даваенны перыяд захавалася няшмат. Тым не менш некаторыя новыя матэрыялы нам удалося знайсці. Вядома, што ва ўрадзе рэспублікі, якую абвясцілі 1 студзеня 1919 года, быў камісар па замежных справах — Усевалад Фальскі. Але мала вядома тое, што менавіта тады ж было створана знешнепалітычнае ведамства. Пачала дзейнічаць дыпламатычная служба — не вельмі разгалінаваная, невялікая: у студзені 1919 года ў камісарыяце працавалі 12 чалавек, уключаючы Усевалада Фальскага.

СТАР. 13

■ Навука і здароўе

## ЯК ЗРАБІЦЬ ЛЕКІ БОЛЬШ АКТЫЎНЫМІ?

### Беларускія фізікі за апошнія гады вынайшлі некалькі спосабаў эфектыўнага выкарыстання лазераў і іншых крыніц святла ў медыцыне

**Самым яркім паспяховым прыкладам выкарыстання святлодыёдаў стала фотатэрапія жаўтухі (гіпербілірубінеміі) у нованароджаных. Першую такую ўстаноўку тады яшчэ на аснове лазера нашы фізікі сумесна з медыкамі распрацавалі за савецкім часам.**
**Са з'яўленнем святлодыёдных лямпаў стакілаграмовы апарат быў заменены на 3-кілаграмовы «Малыш».**
**У радзільнях краіны ўжо 600 такіх апаратаў, і ўсе запатрабаваныя. Паводле сусветных ацэнак, каля 10 працэнтаў немаўлят патрабуюць падобнага лячэння.**

СТАР. 4



## СЁННЯ — ДЗЕНЬ РАТАВАЛЬНІКА

**19 студзеня беларускія ратавальнікі адзначаюць сваё прафесійнае свята. Работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях з гэтай нагоды павіншаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка.**

«У цяперашні час Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі з'яўляецца магутнай аператыўнай структурай, якая энергічна развіваецца, здольная выконваць шырокі дыяпазон задач і валодае велізарным патэнцыялам, — гаворыцца ў віншаванні. — Беларускія ратавальнікі праяўляюць высокі прафесіяналізм пры ліквідацыі пажараў, аварый і наступстваў неспрыяльных з'яў надвор'я, прымаюць актыўны ўдзел у гуманітарных місіях за мяжой».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў гэты святочны дзень мы традыцыйна шануем памяць тых, хто аддаў доўг Радзіме цаной свайго жыцця, чые мужнасць і самаадданасць дазволілі выратаваць мноства людзей ад гібелі. Прэзідэнт выказаў асаблівыя словы ўдзячнасці ветэранам, якія стаялі ля вытокаў стварэння ведамства, а сёння шчодра перадаюць свой багаты вопыт маладому пакаленню.

Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што, абапіраючыся на слаўныя традыцыі, супрацоўнікі МНС і надалей будуць паспяхова вырашаць ускладзеныя на іх задачы.

■ Парламенцкі дзённік

# Нюансы заканатворчасці

## Дэпутаты вучыліся карыстацца інфармацыйна-прававымі рэсурсамі

**Не так даўно кіраўнік дзяржавы зацвердзіў План падрыхтоўкі законапраектаў на 2017 год. Прадугледжваецца распрацоўка 33 нарматыўных дакументаў у розных сферах: ад міжнародных адносін да рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Каб працаваць з такім грунтоўным пакетам, парламентарыям неабходна быць максімальна дасведчанымі. Учора дэпутаты Палаты прадстаўнікоў удзельнічалі ў семінары па азнаямленні з інфармацыйна-пошукавай сістэмай «Эталон» і іншымі рэсурсамі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі.**

— У Палаце прадстаўнікоў новага склікання больш за 70% — новыя людзі, якія, безумоўна, у сваёй мінулай дзейнасці не займаліся нарматворчасцю, — кажа **Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў.** — Таму для іх вельмі шмат новага ў гэтай працы. Сёння мы праводзім семінар, таму што адаптацыя ўжо прайшла, амаль усе дэпутаты актыўна ўключыліся ў работу. Яны ўжо зразумелі, якім аб'ёмам інфармацыі трэба апэрыраваць, каб прафесійна абмяркоўваць той ці іншы законапраект. Заканадаўства — гэта не мастацкая літаратура, тут паняцця «дробязь» не бывае. Нават перастаноўка коскі, змяшчэнне акцэнтаў могуць кардынальна сказіць сэнс таго ці іншага законапраекта.

Па словах віцэ-спікера ніжняй палаты, дэпутату трэба засвоіць і зразумець вельмі вялікі матэрыял. Гэта праблематычна, калі парламентарый не вельмі добра валодае інфармацыйным рэсурсам.

— Нам важна, каб дэпутаты прафесійна выкарыстоўвалі інфармацыйныя рэсурсы, — заявіў Баляслаў Пірштук. — Дэпутат не можа выкарыстоўваць нечыя падказкі, ён павінен добра валодаць тэмай, якой прысвечаны чарговы законапраект. Нам хацелася б, каб усе дэпутаты ў роўнай ступені мелі агульнае ўяўленне пра нарматыўную базу, пра сітуацыю ў краіне — каб максімальна прасоўваць тыя законы, якія яны абмяркоўваюць. Гэта трэба і для таго, каб дэпутаты маглі прафесійна кантактаваць са сваімі выбаршчыкамі.

**Галіна ФІЛІПОВІЧ, член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце,** расказала журналістам пра планы работы Палаты прадстаўнікоў на гэты год.

— Работа дэпутатаў, Пастаянных камісій Палаты прадстаўнікоў арганізавана ў адпаведнасці з планам падрыхтоўкі законапраектаў на чарговы каляндарны год. Калі казаць пра план 2017 года, то мне хацелася б адзначыць, што права заканадаўчай ініцыятывы выкарыстоўвалі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў, Савет Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў. У план уключаны законапраекты, якія ахопліваюць у асноўным усе сферы жыццядзейнасці нашага грамадства і дзяржавы і накіраваны на рашэнне задач, якія былі пастаўлены на пятым Усебеларускім народным сходзе, на выкананне даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Дэпутаты таксама ініцыявалі змяненні ў два законы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by* ■

■ Блізкая ўлада

# Пакуль не сутыкаешся — не бачыш

## Камп'ютарныя гульні, уладкаванне ў садок, упарадкаванне веладарожак, рахункі за тэлефон і асабістыя канфлікты...

**З гэтымі і іншымі пытаннямі звяртаюцца выбаршчыкі да дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Дзмітрыя Гурскага па месцы жыхарства. Каб трапіць на чарговы прыём у Гомелі, людзі тэлефанавалі загадзя. Хваляваліся, ці не перанесена сустрэча.**



— Усё згодна з графікам, — адказвае памочнік Вольга Крупянка.

І роўна ў 16.00 — першы наведвальнік, першая скарга.

Гамяльчанка Іна Аксёнчык эмацыянальна спрабуе даказаць, што яе сын не заслугоўвае статус утрыманца:

— Сын прыйшоў з арміі 15 мая 2015 года. Праз тыдзень ён падаў дакументы у Дэпартамент аховы Савецкага раёна, дзе на працягу 4 месяцаў праходзіў медыцынскую камісію. Урэшце яму сказалі, што ён непрыгодны — камісію ён не прайшоў. 5 кастрычніка яго ўзялі па працоўным дагаворы ў гандлёвы дом «Рагачоў», а з 1 снежня сына перавялі на кантракт. Тым не менш нам прыйшоў ліст — трэба заплаціць. У выніку мы з мужам павінны аддаць за сына гэтыя грошы.

З аналагічным пытаннем да дэпутата звяртаецца і ваенны пенсіянер Міхаіл Ганчароў, які таксама просіць дапамогі ў сувязі з «лістом шчасця» ад падатковай. Ён таксама расказвае пра свайго сына:

— Ён хварэе на псіхічную хваробу, стаіць на ўліку ў адпаведным дыспансеры. Інваліднасць яму не даюць, але з уліку не здымаюць. На працу ўладкавацца не можа. Адкуль у яго грошы? Мы павінны іх выплачваць за хворага сына. Нам кажуць у падатковай: як чалавек вас разумею, але як чыноўнік павінен выконваць дэкрэт.

Дзмітрый Гурскі ўважліва выслухоўвае бацькоў і абяцае разабрацца ў кожнай сітуацыі персанальна. Дае парады, куды звярнуцца па неабходныя даведкі, і каментуе, што дакумент «аб дармаедах» патрабуе сур'ёзнага ўдасканалення. Заўважае: часам людзі расказваюць толькі тую інфармацыю, якая ім выгадна, і нешта не дагаворваюць. Таму пры кожны выпадак абавязкова трэба даведацца і з іншага боку.

У старшыні вулічнага камітэта вуліцы Яраслаўскай Валерыя Рошчына прапаноў шмат. Былы інжынер-дарожнік сёння незадаволены тым, як уладкаваны тратуары, асабліва ў прыватным сектары горада. Да таго ж дадае, было б зручна, каб веласіпедыстам дазволілі ў межах горада ездзіць па праезнай частцы, а не па тратуарах.

Дзмітрый Гурскі не згодзен з наведвальнікам:

— Мы знаходзімся ў цэнтры Еўропы і не можам не ўлічваць вопыт нашых заходніх суседзяў. Там ўсюды веласіпедысты ездзяць па тратуарах. У нас сапраўды пакуль не паўсюдна ёсць абазначэнне паласы руху для іх, але ж працэс паступова ідзе. Да таго ж, калі веласіпедыстам было дазволена ездзіць па аўтадарогах, няшчасных выпадкаў з цяжкімі наступствамі было значна больш.

Другая прапанова пенсіянера датычыцца камп'ютарных гульняў. Ён выказвае меркаванне, што пры іх продажы павінна быць абавязковае папярэджанне, што гульня можа быць небяспечнай:

— Можа, трэба пісаць, колькі дзецям можна гуляць часу і гэтак далей?

Дзмітрыю Гурскаму развагі пра камп'ютарныя гульні падабаюцца. Ён згодны: сапраўды, іх продаж павінен ажыццяўляцца асобам, старэйшым за 18 гадоў:

— Важна, каб не дзеці самі сабе куплялі гульні, а каб бацькі неслі за гэта адказнасць. Тым больш, што многія камп'ютарныя гульні ўтрымліваюць элементы жорсткасці, эротыкі і іншыя небяспекі для псіхічнага здароўя непаўналетніх.

У Алены Маслянковай, шматдзетнай маці, пытанне датычыцца ўладкавання ў садок малодшага сына, з якім яна цяпер у водпуску па доглядзе дзіцяці. Па былым месцы жыхарства яны стаялі ў чарзе на месца ў садку, але ж па прыватных прычынах сям'я пераехала ў аддалены раён горада, дзе месцаў у школе-садку няма:

— У Прыбарскай школе-садку перад намі яшчэ 9 дзяцей у чарзе. Мне прапанавалі Урыцкае. Але маё дзіця не пераносіць перавозак — у яго слабы вестыбулярны апарат. У мяне няма бабулек, і застаецца толькі звальняцца з працы ці мне, ці мужу, каб даглядаць дзіця.

Жанчына — юрыст па адукацыі, і сама разумее, што ў гэтай складанай жыццёвай сітуацыі няма іншага выхаду. Дарэчы, яшчэ адна наведвальніца просіць дэпутата пазбавіць яе... ад пастаянных абраз 19-гадовага сына:

— Мы жывём у трохпакаёвай кватэры ўтраіх. Сын, дачка з сіндромам Даўна, якой 21 год, і я. Сын затэрарызаваў мяне і дачку. Міліцыя сітуацыю ведае. Што рабіць далей? Ён не дае нам спакойна жыць.

Дэпутат не псіхолаг, але ж спрабуе пагаварыць з жанчынай пра тое, што прыватнае жыццё сям'і прыйдзецца наладжваць асабістымі намаганнямі. Размяняць жылплошчу ці заяўляць у міліцыю на сына з мэтай выселіць яго з кватэры — гэта выбар самой маці і ніхто за яе яго не зробіць.

Пенсіянер Васіль Лісіцкі незадаволены рахункамі, выстаўленымі яму за карыстанне стацыянарным тэлефонам:

— Чаму бяруць грошы, калі ты здзейсніў званок, але не дазваніўся? У мяне за месяц так атрымалася аж 12 разоў!

Між тым, каментуе сітуацыю Дзмітрый Гурскі, прадпрыемства, якое ажыццяўляе паслугі стацыянарнай тэлефоннай сувязі, можа дыктаваць умовы — бо яно манапаліст у краіне і выбару ў кліента няма. Калі б была сапраўдная канкурэнцыя паміж пастаўшчыкамі такіх паслуг, магчыма, тарыфы былі б больш гнуткімі:

— Пакуль не сутыкаешся асабіста — не бачыш, якія ў людзей набалелыя праблемы. Што тычыцца жыровак, тут павінен быць узаемны працэс. Сёння атрымліваецца, калі кліент пратэрмінаваў і своечасова не аплаціў паслугі ЖКГ, яму выстаўляюць пеню. А чаму прадпрыемствы гэтай галіны, калі няправільна зрабілі разлікі, не выплачваюць людзям кампенсацыю? Яны ж грашыма кліента скарысталіся. Наша камісія па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве цяпер займаецца і законапраектам, які павінен рэгламентаваць утрыманне жывёл. Пытанняў многа. Трэба ўвесці абмежаванне па колькасці хатніх жывёл, якіх можна трымаць у кватэры. Трэба вызначыць асобна, што гаспадары павінны прыбіраць за жывёламі, якіх выгульваюць на вуліцы.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by* ■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## НА НАВАГРУДЧЫНЕ ПАБУДУЮЦЬ ЯШЧЭ ТРЫ ВЕТРАКІ

**Аб тым, што ў раёне праз год можа з'явіцца новы ветрапарк, паведамляе камітэт эканомікі Гродзенскага аблвыканкама.**

Акцыянернае таварыства «ЭкаВецер» прапанавала рэгіянальным уладам заключыць інвестдагаворы па будаўніцтве трох ветраэнергетычных установак магутнасцю 1,5 МВт. Прадпрыемства збіраецца ўстанавіць ветракі да чэрвеня 2018 года і ўкласці ў рэалізацыю кожнага з іх па 585 тысяч рублёў. Пры гэтым будзе створана шэсць новых працоўных месцаў. Ужо сёння спецыялістамі вызначаны пляцоўкі, дзе могуць з'явіцца гэтыя ветраўстаноўкі. Па адным ветраку запланавана пабудаваць каля вёсак Асмолава, Жданавічы і Пятрэвічы Навагрудскага раёна. Інвестарамі распрацавана праектна-каштарысная дакументацыя.

Трэба сказаць, што Навагрудскі раён з'яўляецца адным з найбольш спрыяльных у Гродзенскай вобласці з пункту гледжання выкарыстання энергіі ветру. На Навагрудскім узвышшы ўжо цяпер размешчана ажно 18 ветраўстановак, якія паспяхова эксплуатуюцца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ДОЎГ ЗА ТЭХНІКУ, ЯКОЙ НЯМА

**Маніторынг па гатоўнасці да веснавой сяўбы, праведзены ў гаспадарках Буда-Кашалёўскага раёна, выявіў асобныя факты разукамплектавання сельгастэхнікі.**

У Камітэце дзяржкантролю Гомельскай вобласці паведамілі, што ў ААТ «Рагінь» знойдзена два раскамплектаваныя камбайны КЗС-10К-07. Да таго ж іх апорныя элементы маюць расколіны, дэмантаваны рухавік, радыятары, элементы гідрасістэмы і г.д. Гэтыя агрэгаты былі пастаўлены гаспадарцы ААТ «Гомельаблаграсэрвіс» у ліпені 2008 года па дагаворах лізінгу, але і цяпер запазычанасць па плацяжах не пагашана. Яна складае Br37,2 тысячы. Таксама цалкам раскамплектаванай знойдзена і іншая сельгастэхніка, набытая ў лізінг. Агульная запазычанасць па такіх плацяжах складае больш як Br80 тыс.

Спецыялісты дзяржкантролю адзначаюць, што не занадта турбаваў стан гэтай сельгастэхнікі яе ўласніка — Гомельаблаграсэрвіс. Упраўленнем па сельскай гаспадарцы і харчаванні Буда-Кашалёўскага райвыканкама за недастатковасць работы па прывядзенні тэхнікі ў належны стан цалкам пазбаўлены прэміяльных выплат два кіраўнікі. Пра факты раскамплектавання сельгастэхнікі праінфармаваны ўласнік Гомельаблаграсэрвіса Гомельскі аблвыканкам — для прыняцця мер па спагнанні матэрыяльнай шкоды.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ТРЭНД ЧАСУ — НАБЫЦЦЁ БІЛЕТАЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Беларуская чыгунка летась павялічыла продаж білетаў праз інтэрнэт.**

У 2016 годзе такім чынам было аформлена больш за 1,6 мільёна праязных дакументаў, што складае 111,6 працэнта да ўзроўню папярэдняга года, у тым ліку з электроннай рэгістрацыяй — 1,4 мільёна ці 112,3 працэнта, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Удзельная вага продажу білетаў праз інтэрнэт (ад агульнай колькасці праязных дакументаў, афармленых праз АСУ «Экспрэс» у білетных касах чыгункі) павялічылася з 10,3 працэнта ў 2015 годзе да 13,7 працэнта ў 2016-м.

Цягам апошніх гадоў магістраль вызначае мільённага інтэрнэт-пасажыра. Калі ў 2014 годзе такі быў зафіксаваны ў снежні, у 2015 годзе ў верасні, дык летась продаж мільённага электроннага праязнога дакумента на сайце сістэмы продажу адбыўся ў жніўні. Гэта сведчыць пра тое, што папулярнасць набыцця білетаў праз інтэрнэт штогод расце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Камунальныя стасункі

# Аварыя ліквідуецца неадкладна

## Сталічная сістэма ЖКГ падводзіць вынікі рэформы

**Новаўвядзенні, якія пачалі ўкараняць каля двух гадоў таму, у першую чаргу закранулі падзел функцый заказчыка і выканаўцы. Раней ЖРЭА, па сутнасці, аказвалі паслугі самім сабе, што ў пэўнай ступені паслабляла кантроль за якасцю. Цяпер за правы правадзіць пэўныя работы, напрыклад, прыбіраць пад'езды, дзяржаўныя арганізацыі і прыватныя кампаніі, змагаюцца на тэндарнай аснове.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ адной важнай навіной стала стварэнне кантакт-цэнтра ЖКГ і ўвядзенне адзінага тэлефоннага нумара 115. У лістападзе 2015 года кантакт-цэнтр пачаў сваю работу ў двух раёнах горада: Партызанскім і Першамайскім, ужо да канца лютага 2016-га да службы паступова далучыліся і астатнія раёны.

Як адзначыў **начальнік упраўлення кантакт-цэнтра г. Мінска Ігар КІРЫЛЕНКАЎ**, служба працуе ў рэжыме 24/7. Усе выклікі, якія паступаюць на нумар 115, фіксуюцца. Раней, калі не існавала адзінага нумара, толькі кожны чацвёрты выклік афармляўся ў заяўку, цяпер можна пракантраляваць нават тое, колькі разоў мінчане звяртаюцца па адным і тым жа пытанні. Работа тэлефоннай лініі арганізавана па прынцыпу ва ўсім свеце стандарце 80/40: на працягу 40 секунд 80% заяўнікаў павінны датэлефанавацца. Аднак гэтыя параметры не выконваюцца ў выпадку буйной аварыі. Калі ж з праблемай жыхар сталіцы звяртаецца на інтэрнэт-партал 115.бел, адказ павінен паступіць на працягу васьмі рабочых дзён. За час існавання партала было прынята каля 48 тысяч заявак, больш за 90% праблем атрымалася вырашыць.

— Здавалася б, кароткі просты нумар — гэта добра, аднак на 115 нярэдка тэлефануюць, каб выклікаць таксі, заказаць піцу ці ўдакладніць расклад руху аўтобусаў, — з усмешкай расказаў Ігар Кірыленкаў.

Па словах начальніка ўпраўлення кантакт-цэнтра, тэматыка зваротаў носіць сезонны характар: узімку цікавяць пераважна пытанні ацяплення і энергазабеспячэння, а летам — санітарнага стану і водазабеспячэння. Адна з задач кантакт-цэнтра — аналізаваць характар выклікаў. Дзякуючы гэтаму, у кожным раёне былі вызначаны 10 самых «праблемных» па розных параметрах дамоў.

**Генеральны дырэктар дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Віталь СМІРНОЎ** нагадаў, што з мэтай аптымізацыі 131 ЖЭС была пераўтворана ў 48 ЖЭУ. Саму арганізацыю ўзбуйнілі: да яе далучыліся «Ліфтсэрвіс», «Белліфт», «Мінскводаканал», «Мінсккамунцепласеткі». У той жа час няпрофільныя актывы — фарфоравы завод, ваенкаматы, кароўнікі, цеплатрасы, кабельныя сеткі, вадаводы — перасталі адносіцца да арганізацыі. Аб'екты, якія доўгі час не эксплуатаваліся, былі знесены. Усе разрозненыя разлікова-даведачныя цэнтры аб'яднаны ў адзіны. Каля 650 адзінак тэхнікі, якія былі задзейнічаны зрэдку, перададзены спецыялізаваным арганізацыям.

Што датычыцца машыннай уборкі двароў ад снегу, то рабіць гэта з прычыны занятасці двароў аўтамабілямі вельмі цяжка. Ёсць вялікая рызыка пашкодзіць іх. Акрамя таго, мінчане адгукнуліся на пастанову, якая датычыцца ўборкі сваіх машына-месцаў. У перыяд моцных снегападаў мінімум траціна з іх была расчышчана.

Складаным пытаннем застаецца ўкараненне покватэрнага ўліку цяпла. Цяпер у Мінску ёсць 600 дамоў, дзе ўжо можна весці падобны тып уліку, аднак паслугай карыстаюцца жыхары толькі 200 з іх. Астатніх бянтэжыць тое, што спачатку трэба будзе аплаціць поўны кошт, а пра пераразлікі, а адпаведна і вяртанне грошай, можна будзе казаць толькі пасля заканчэння ацяпляльнага сезона. Аднак тыя, хто ўжо карыстаецца паслугай, лічаць яе вельмі зручнай.

Дырэктар аб'яднання выступіў супраць павелічэння пені за неўплату паслуг. Даўжнікі складаюць менш за 3% ад агульнай колькасці плацельшчыкаў, большасць з іх трапляюць у спісы з-за непамятлівасці, таким чынам праблема вырашаецца на працягу 2—3 дзён.

Высяленне — гэта крайняя мера. У мінулым годзе было вынесена такое рашэнне толькі ў шасці выпадках, аднак жыльцы пакуль не выселеныя, у іх усё яшчэ ёсць права пагасіць запазычанасць.

— Сярод нашых асноўных задач — палепшыць якасць паслуг без павышэння тарыфаў. У 2016 годзе насельніцтва Беларусі аплачвала каля 60% кошту жыллёва-камунальных паслуг, да 2018 года лічба павінна дасягнуць 100%, — сказаў Віталь Смірноў. — Дзякуючы рэформе ЖКГ Мінска ў мінулым годзе ўдалося сэканоміць 35 мільёнаў дэнамінаваных рублёў.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Справы духоўныя

# СЭНС НЕ Ў ВАДЗЕ, А Ў СУТНАСЦІ СВЯТА

## Сёння праваслаўныя вернікі адзначаюць Хрышчэнне Гасподняе

**У гэтыя дні Праваслаўная царква і сапраўды веруючыя людзі надаюць значэнне не вадзе, а самой падзеі — святу Хрышчэння. Так лічыць матушка Гаўрыла, ігумення Гродзенскага жаночага манастыра Нараджэння Багародзіцы.**

«Гасподзь хрысціўся, таму праз ваду і мы можам асвяціцца і ачысціцца. Ён дае нам такую магчымасць, калі адбываецца асвячэнне вады — Вялікая агіясма. Трэба разумець, што вадохрышчанская вада абсалютна аднолькавая і ў сачэўнік, і ў само свята», — расказвае матушка. Па яе словах, святую ваду, што засталася з мінулага года, можна без боязі піць. «У мяне стаіць вадохрышчанская вада, змешаная з прывезенай калісьці з Іерусаліма, і ўжо 12 гадоў не псуецца і цалкам свежая, нібы ўчора набраная, — дзеліцца досведам ігумення. — Рэч не ў тым, колькі яна прастаіць, а ў тым, што такая вада асвечана благадаццю Святога Духа. Сёння, у Хрышчэнне, ёй можна самастойна асвячаць жытло, свойскіх жывёл, а таксама не забывацца самім пачаставацца. Традыцыйна святую ваду п'юць нашча, а 19 студзеня яе можна ўжываць увесь дзень у любы час. Але спачатку перахрысціцца, з верай прымаючы на вылячэнне душы і цела».

Так, існуе паданне, што апоўначы з 18 на 19 студзеня Анёл Гасподні сыходзіць з неба і асвячае ўсе воды, усе крыніцы: рэкі, моры, акіяны. Таму нездарма ў савецкія часы, калі храмаў было мала, калі людзі баяліся прыйсці ў царкву, яны зачэрпвалі ваду ў калодзежы ці з возера, і яна лічылася асвечанай і сапраўды не псавалася некалькі гадоў. Людзі, кажа матушка Гаўрыла, прытрымліваючыся набожнай традыцыі, ідуць у ноч на свята на так званую Іардань: у рэках і азёрах робяць палонкі і акунаюцца ў ваду. У каго няма такой магчымасці, асабліва ў гарадах, набіраюць ваду з-пад крана ў вядро і тройчы абліваюць сябе. «Гэтыя дзеі — не панацэя і не містыка. Нельга забывацца, што ўсё трэба рабіць з верай. Ніколі яшчэ ніхто не захварэў, калі падчас аблівання ці акунання маліўся ці чытаў малітву альбо трапар да Хрышчэння», — нагадвае яна.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Пытальнік

# У ПАРАДКУ ЧАРГОВАСЦІ

## На жаль, «адразу і паўсюдна» пачысціць дарогі немагчыма

**Прывітанне, сітуацыя такая. Я плачу падатак за нашы «добрыя» дарогі, але даехаць да бацькоў у вёску Дворышча Дзяржынскага раёна не магу. Дарогі проста не чысцяць — ніяк. Пішам, тэлефануем, гаворым, а толку нуль!.. Дайшло да таго, што аўтобусы адмаўляюцца ехаць па маршруце, паколькі дарогі няма, толькі «ваўчыныя сцежкі». У вёсках шмат пажылых людзей, ніякая «хуткая дапамога» да іх не даедзе. Па цэнтральных дарогах ездзіць снегаўборачная тэхніка, літаральна на некалькі метраў заязджаючы ў вёску. Сказалі, што «гэта не іх участак». А чый тады? Сельскі савет ніяк не жадае вырашаць нашу праблему.**

**Алег,** *г. Мінск*

Па сутнасці (і, дарэчы, у адпаведнасці з заканадаўствам), мы маглі не адказваць на гэты зварот, паколькі ён з'яўляецца цалкам ананімным. Апошняя акалічнасць, бясспрэчна, дадала аўтару смеласці і эмоцый у абвінавачваннях (скаргу даём у скарочаным выглядзе). Тым не менш рэдакцыя вырашыла не пакідаць гэтае пасланне без рэагавання.

Вось што нам расказала **кіраўнік справамі Дзямідавіцкага сельскага Савета Раіса КАЛОДНІК** (калі яна зняла трубку ў момант нашага звароту, было чутно, што на кантролі якраз стаіць пытанне з расчысткай вуліц, якое сураазмоўца абмяркоўвала з іншымі работнікамі):

— Ёсць Парадак чарговасці і дырэктыўныя тэрміны ачысткі, устаранення слізкасці на аўтамабільных дарогах Мінскай вобласці, які ўзгоднены начальнікам УДАІ УУС Мінаблвыканкама і зацверджаны генеральным дырэктарам КУП «Мінскаблдарбуд». Узроўні патрабаванняў з гэтага дакумента ўзгоднены з АДАІ раёнаў і зацверджаны райвыканкамамі.

У першую чаргу ачыстка ад снегу і апрацоўка процігалалёднымі матэрыяламі праводзіцца на асноўных аўтамабільных дарогах і дарогах з аўтобуснымі зносінамі. У другую чаргу — на аўтамабільных дарогах і транзітных праездах па населеных пунктах, дзе ёсць школы, бальніцы, вытворчыя памяшканні. У трэцюю чаргу — на пад'ездах да асобных населеных пунктаў і вуліцах, замацаваных на праве гаспадарчага распараджэння за КУП «Мінскаблдарбуд». У чацвёртую — на пад'ездах да садаводчых таварыстваў.

Па словах Раісы Уладзіміраўны, цэнтральныя вуліцы пачынаюць чысціць з ночы. Затым надыходзіць чарга сацыяльных аб'ектаў і вытворчых прадпрыемстваў, пад'ездаў да тых жа фермаў, напрыклад, а ўжо пасля вуліц у населеных пунктах. Але трэба разумець, што зрабіць усё адначасова папросту немагчыма фізічна: тэхнікі не хапае. Хоць кіраўнік справамі сельскага Савета адзначыла старанную работу ДРБУ-210, да таго ж дапамогу тэхнікай аказвае агракамбінат «Ждановічы». «Людзям трэба ўвайсці ў становішча. Вось літаральна сёння (на момант нашага звароту. — **Аўт.**) мы заканчваем расчыстку».

— Але, бывае, з-за пакінутага асабістага транспарту грамадзян у снегаўборачнай тэхнікі ўзнікаюць цяжкасці з праходжаннем. Чаму б у такіх выпадках самому не ўзяць рыдлёўку і не дапамагчы? — слушна заўважыла Раіса Калоднік.

Што тычыцца аўтобусаў, якія быццам бы не ідуць па сваіх маршрутах, суразмоўца заўважыла, што такіх скаргаў не паступала. Два аўтобусы з Мінска курсіруюць, як належыць, «я сама езджу на іх». Пра «хуткую дапамогу» кіраўнік справамі сельскага Савета заўважыла, што цэнтральныя вуліцы расчышчаюцца, а дайсці да іх з іншых — не такая вялікая праблема.

Напрыканцы нашай размовы Раіса Уладзіміраўна сказала: «Мне шчыра шкада трактарыстаў. Я бачу, колькі яны працуюць — з ночы да позняга вечара, як стараюцца!»

...Цалкам зразумела, што ўсім нам хочацца камфортных умоў. Але, прабачце, нават у вялікім горадзе пасля снегападу да ранку расчышчаны толькі цэнтральныя магістралі ды прыбраны плошчы каля пад'ездаў. А збоч крыху ўбок і, сапраўды, будуць тыя самыя «сцежкі». Але ж ніхто не дакарае дворнікаў, якія шчыруюць на марозе з рыдлёўкамі, калі большасць гаражан яшчэ спіць. Можа, і заяўніку трэба быць усё ж найперш удзячным тым трактарыстам, якія працуюць ад цямна да цямна?..

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# КУДЫ Ў СУБОТУ «ЎЛАДКАВАЦЬ» ПЕРШАКЛАСНІКА?

**«Растлумачце, калі ласка, як 21 студзеня павінны працаваць школы ў Мінску? Ва ўсіх арганізацыях і на прадпрыемствах працоўны дзень быў перанесены з 2 студзеня на бліжэйшую суботу. Але ў школах у пачатку года былі зімовыя канікулы. І цяпер педагогі заявілі бацькам, што субота ў іх — непрацоўны дзень. Ці маюць яны рацыю? Тым больш што размова ідзе пра першакласнікаў, якіх нельга пакінуць без нагляду, трэба чымсьці заняць, а настаўнікі ў гэтым дапамагчы нам не хочуць...» — з такім пытаннем у рэдакцыю звярнуліся бацькі вучняў адной са сталічных гімназій.**

Як растлумачыла нашаму карэспандэнту **намеснік начальніка аддзела выхаваўчай і ідэалагічнай работы камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Надзея ВЯЛІКАЯ**, установы дашкольнай адукацыі 21 студзеня будуць працаваць у сталіцы ў звычайным рэжыме, а установы агульнай сярэдняй адукацыі — у рэжыме шостага школьнага дня з правядзеннем спартыўных, культурна-забаўляльных і прафарыентацыйных мерапрыемстваў... Што датычыцца вучняў пачатковай школы, якіх мерапрыемствы шостага школьнага дня закранаюць у меншай ступені, то камітэт па адукацыі рэкамендаваў усім раённым упраўленням адукацыі забяспечыць пры неабходнасці работу дзяжурных груп прадоўжанага дня. Рэальную патрэбу ў такіх групах могуць ведаць толькі на месцах. Таму ў раёнах павінны гэту інфармацыю ў школах сабраць і ўжо на яе падставе вырашаць, колькі такіх груп арганізаваць. Надзея Вялікая запэўніла: «Бацькам хвалявацца не трэба. Дзяцей мы ў суботу адных не кінем».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# МАСАВАЕ НАШЭСЦЕ АМАТАРАЎ ДАРМОВАЙ РЫБЫ

**На былых пляцоўках, дзе здабывалі торф у Жабінкаўскім раёне, утварыліся вадаёмы, злучаныя паміж сабой меліярацыйнымі каналамі. Гэта надзвычай рыбныя мясціны. З надыходам маразоў рыба церпіць ад недахопу кіслароду і шукае адкрытую паверхню. Апошняе і прываблівае аматараў дармовай рыбы.**

Ужо з тыдзень на былых торфараспрацоўках каля вёсак Сычова, Багданы, Мышчыцы заўважаны дзясяткі машын. Паводле слоў **намесніка начальніка Брэсцкай абласной інспекцыі аховы жывёльнага і раслиннага свету Сяргея ШТЫКА**, у мінулыя выхадныя інспектары налічылі каля паўтары сотні машын, а значыць, ля вады пабывала пад 500 чалавек. Рыбаловы выразаюць лункі бензапіламі і самымі рознымі прыладамі здабываюць шчупакоў, лінёў, плотак, акунёў, канальнага соміка. Лік ідзе на тоны. Пры гэтым лаўцы знішчаюць тысячы малькоў, якіх часцей за ўсё выкідваюць на снег.

Кожны дзень інспектары аховы прыроды складваюць пратаколы, штрафуюць парушальнікаў. Але сілы няроўныя. Гэтым і карыстаюцца шматлікія браканьеры, спадзеючыся, што кожнага з іх «пранясе». Такая сітуацыя складваецца не першы год, так, хутчэй за ўсё, і будзе далей, пакуль мясцовая ўлада не прыме меры.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

# ЯК ЗРАБІЦЬ ЛЕКІ БОЛЬШ АКТЫЎНЫМІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

ПРЫ высокіх узроўнях білірубіну, павышаная колькасць якога ў крыві забяспечвае скуры жоўты колер, арганізм падвяргаецца моцнай інтаксікацыі, ад якой асабліва пакутуе галаўны мозг, а таму парушаецца разумовае развіццё ды яшчэ і слых. Пачынаецца жаўтуха нованароджаных звычайна на трэці дзень пасля нараджэння. Як дапамагчы ў гэтым выпадку? Ва ўсім свеце прымяняюцца ўсяго два спосабы лячэння — фотатэрапія або заменнае пераліванне крыві. Заменнае пераліванне крыві выкарыстоўваецца ў крайнім выпадку, калі не дапамагла фотатэрапія, што здараецца даволі рэдка.

— Мы працягваем удасканальваць гэты фотатэрапеўтычны апарат, вывучаем механізм уздзеяння светлавога выпраменьвання на розныя біялагічныя сістэмы, — тлумачыць **намеснік дырэктара па навуковай і інавацыйнай рабоце Інстытута фізікі імя Б.І. Сцяпанава НАН Беларусі, кандыдат фізіка-матэматычных навук Віталь ПЛАЎСКІ.** — Вядома, што святло ўздзейнічае на білірубін. Гэта рэчыва не раствараецца ў вадзе, і таму дрэнна выводзіцца з мачой, а пад уздзеяннем святла становіцца часткова растваральным. Вядома ўжо і тое, што пад уздзеяннем святла ўтвараецца шмат тыпаў ізамераў білірубіну, у тым ліку тыя, што выводзяцца найлепш. Мы спрабуем мяняць даўжыню хвалі святла, якое садзейнічае ўтварэнню такіх тыпаў. Гэта, зразумела, павысіць эфектыўнасць уздзеяння.

Адначасова спрабуем высветліць, як знізіць пабочны эфект ад такога лячэння для дзяцей з экстрэмальна нізкай вагой, ад 500—700 г. Наогул, чым ніжэйшая вага і ранейшы тэрмін нараджэння, тым вышэйшая верагоднасць з'яўлення жаўтухі — захворванне сустракаецца ў гэтай катэгорыі ў 80—90 працэнтах выпадкаў. Для такіх дзяцей патрабуюцца іншыя дозы і спектр святла. Гэтай навуковай работай мы зацікавілі калег з Кітая.


Фота БЕЛТА.

А вось другі апарат — «АНКУБ-спектр», таксама справа рук нашых вучоных. З яго дапамогай можна кантраляваць узровень білірубіну ў крыві без забору і траўмуючых уколаў. Гэта важна ў тых выпадках, калі неабходна кантраляваць узровень рэчыва амаль штогадзінна — ёсць і такія формы жаўтухі. Светлавы прыбор вызначае білірубін на аснове святла, адлюстраванага ад скуры на пераноссі. Прыбор таксама знайшоў шырокае прымяненне ў радзільных дамах.

Дарэчы, пра ўздзеянне святла на пажаўцелую скуру нованароджаных людзі даведаліся выпадкова. Было гэта ў Англіі. Там нехта звярнуў увагу, што ўчастак агаленай скуры ў малога, якое ляжала насупраць акна, пасвятлеў у адрозненне ад скуры, прыкрытай тканінай. Паступова ўдалося высветліць, святло якога менавіта спектра паглынае білірубін. Вынаходства ўсё новых крыніц святла — галагенавых, флюарэсцэнтных, святлодыёдных і іншых лямпаў — прымушала вучоных вывучаць, што найбольш карысна ўздзейнічае на чалавека.

ЯШЧЭ адна цікавая тэма, над якой працуе інстытут, — антымікробная фотадынамічная тэрапія. Тэма надзвычай актуальная. У свеце існуе вялікая колькасць антымікробных прэпаратаў — антысептыкаў і антыбіётыкаў, аднак іх шырокае выкарыстанне, у тым ліку ў ветэрынарыі, той жа птушкагадоўлі, рэгулярнае ўжыванне ў малых дозах усімі намі прывяло да развіцця ўстойлівасці. ЗША нават прызналі антымікробную рэзістэнтнасць нацыянальнай пагрозай.

— Гэта азначае, што сёння ў свеце людзі гінуць нават ад элементарнай інфекцыі, таму што не існуе лячэння, здольнага ім дапамагчы. Часткова гэту праблему можа вырашыць антымікробная фотадынамічная тэрапія, — кажа Віталь Юльянавіч.

Вучоныя звярнулі ўвагу на тое, што антысептыкі і антыбіётыкі адносяцца да ліку фотасенсібілізатараў — яны адчувальныя да святла, пад яго ўздзеяннем прэпараты пачынаюць працаваць эфектыўней у некалькі разоў, у выніку чаго мікробныя клеткі гінуць. Той жа прынцып пакладзены ў аснову фотадынамічнай тэрапіі пухлін, калі спачатку хвораму ўводзіцца прэпарат-фотасенсібілізатар, здольны ў вялікай колькасці назапашвацца ў пухліне, а пасля прымяняецца лазернае святло, якое прэпарат пачынае выдатна паглынаць, што ў некалькі разоў узмацняе дзеянне прэпарата. Гэтак дзейнічае наш вядомы «Фаталон», аснова для стварэння якога распрацавана ў Інстытуце фізікі і які цяпер ва ўдасканаленай форме вырабляецца Белмедпрэпаратамі — ён прымяняецца для лячэння розных формаў анкалагічных захворванняў на пачатковых стадыях.

Паглынаючы пэўныя хвалі святла, фотасенсібілізатары актывізуюць малекулы кіслароду, той становіцца настолькі актыўным, што гатовы шкодзіць любым клеткам, у якіх знаходзіцца, напрыклад, пухлінным. Або мікробным. Такі спосаб лячэння здольны прымусіць працаваць нават самыя простыя антысептыкі і антыбіётыкі, да якіх раней развілася ўстойлівасць. Розніца толькі ў спектрах святла. Вучоныя-фізікі іх адшукалі, і цяпер з дапамогай апарата фотадынамічнай тэрапіі «Лотас» (іх па краіне ў лячэбных установах ужо больш за сотню) можна лячыць, напрыклад, гнойныя раны або язвы страўніка. Дарэчы, язвы, абумоўленыя хелікабактэрнай інфекцыяй, можна лячыць у дзяцей з дапамогай антысептыка, які даўно знік з выкарыстання, — гэта «сінька». Некалі досыць магутны антысептык, ён паступова вычарпаў свой рэсурс і цяпер нават не прадаецца ў аптэках. Высветлілася, што «сінька» выдатна паглынае святло і можа прымяняцца супраць такога мікроба, як хелікабактар пілары. Пашкоджаны ўчастак страўніка спачатку арашаецца знутры з дапамогай зонда, потым па спецыяльным святлаводзе падаецца святло. Дастаткова аднойдзвюх працэдур — і ніякіх пабочных эфектаў.

АЛЕ гэта яшчэ не ўсё. Вывучэнне механізму гібелі мікробных клетак паказала, што яны самі па сабе змяшчаюць рэчывы-фотасенсібілізатары, а таму пры пэўнай інтэнсіўнасці святла можна абысціся і без увядзення ўсякіх лекаў! Інакш кажучы, мікробныя клеткі могуць пашкоджвацца без лекавых прэпаратаў, пад уздзеяннем аднаго толькі святла. І такія лазеры і святлодыёды ўжо існуюць.

— Цяпер мы займаемся ўкараненнем у практыку гэтай тэхналогіі з мэтай лячэння перыядонта — вынішчэння мікробаў у ротавай поласці, — адзначае вучоны. — Антымікробная фотадынамічная тэрапія набірае моц. Запатэнтавана ўжо дзесяць магчымасцяў яе выкарыстання менавіта такім чынам. Прымяняцца пры гэтым будуць айчынныя прэпараты. Для лячэння тых жа гінекалагічных захворванняў можна цяпер паспяхова выкарыстоўваць самыя простыя лекі. Можна вярнуць у выкарыстанне фурацылін, фурагін, настойку зверабою, эўкаліпту, дыягіперон. Сумесна з РНПЦ отарыналарынгалогіі распрацоўваем методыку лячэння запаленчых захворванняў вуха, горла і носа. Святлавод дазваляе пранікаць у любыя поласці арганізма — праўда, праз тканку, на жаль, святло не пранікне, таму метад застанецца інвазіўным, але неверагодна эфектыўным. Распрацоўваецца і апарат для лячэння грыпу. Праўда, для вынішчэння віруса неабходна праводзіць забор крыві, апрацоўваць яе ўльтрафіялетам і ўводзіць назад...

*Урэшце, узнікае смелае пытанне: а чаму б не стварыць такую лазерную апаратуру, якой можна было б карыстацца ў дамашніх умовах? Тэарэтычна тут няма ніякіх цяжкасцяў, аднак на практыцы... Для дасягнення лячэбнага эфекту вельмі важнай будзе дазіроўка (нельга ні крыху больш, ні крыху менш), патрабуецца пэўная магутнасць асвятлення, што павінна суправаджацца адпаведнымі мерамі засцярогі. Трапіўшы на сятчатку, лазер можа справакаваць развіццё катаракты. Нездарма падчас працэдуры і пацыент, і ўрач карыстаюцца спецыяльнымі ахоўнымі акулярамі, але няма гарантыі, што ў дамашнім выкарыстанні пацыенты будуць рабіць так, як урач у стацыянары. Таму дзеля бяспекі карыстальнікаў вытворцы будуць вымушаны знізіць інтэнсіўнасць выпраменьвання, але ж і лячэбнага эфекту тады не будзе.*

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
protas@zviazda.by

■ Асноўныя прыкметы

# 10 БАЛАЎ — ГЭТА РЭДКАСЦЬ

## Усіх немаўлят у радзільнях ацэньваюць па шкале Апгар

**Шкалу прыдумала амерыканскі ўрач-анестэзіёлаг Вірджынія Апгар для ацэнкі стану здароўя нованароджанага. У 1952 годзе яна прадставіла гэту сістэму на кангрэсе анестэзіёлагаў.**


Фота БЕЛТА.

Для запамінання крытэрыяў прапанавала выкарыстоўваць пяць літар свайго прозвішча:
**a**ppearance — знешні выгляд (колер скуры);
**p**ulse (heart rate) — пульс (частата сардэчных скарачэнняў);
**g**rimace (response to stimulation) — грымаса, якая ўзнікае на нейкае раздражненне;
**a**ctivity (muscle tone) — актыўнасць рухаў, мышачны тонус;
**r**espiration — дыхальныя рухі.

У балах ацэньваюцца пяць асноўных прыкмет здароўя/нездароўя: афарбоўка скуры, частата сардэчных скарачэнняў за 1 хвіліну, рэфлексы, мышачны тонус і дыханне. 7—10 балаў — гэта здароўе, менш за 3 — крытычны стан.

— Усе немаўляты, якія з'явіліся на свет у радзільні, ацэньваюцца па шкале Апгар урачом-неанатолагам, які прысутнічае пры родах, — тлумачыць **загадчыца лабараторыі клінічнай неанаталогіі, рэабілітацыі нованароджаных і дзяцей першага года жыцця РНПЦ «Маці і дзіця», кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт Таццяна ГНЯДЗЬКО.** — Кантроль пяці паказчыкаў праводзіцца праз 1 і 5 хвілін пасля нараджэння. У некаторых выпадках, пры пярвічнай суме балаў ніжэйшай за 7, ацэнка выстаўляецца і пасля 10-й хвіліны жыцця, калі можа ісці размова аб правядзенні неадкладнай рэанімацыі. 0—7 балаў па шкале Апгар паказваюць на неспрыяльныя фактары развіцця плода, паталогію ў родах, нізкую жыццяздольнасць, магчымасць узнікнення неўралагічных парушэнняў да 1 года, неабходнасць правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў урачом-неанатолагам або анестэзіёлагам-рэаніматолагам. Павелічэнне сумы балаў праз 5 хвілін пасля нараджэння на фоне праведзенай рэанімацыі сведчыць аб эфектыўнасці лячэння...

Шкала Апгар — простая і даступная сістэма падліку балаў у сумарную колькасную ацэнку стану немаўлят. Яна вызначае ўрачэбную тактыку назірання і лячэння пасля нараджэння. Матулі паведамляюць звычайна дзве лічбы, напрыклад, 8—9 балаў. Ацэнка фіксуецца ў медыцынскай дакументацыі, выпісным эпікрызе, абменнай картцы, улічваецца для вызначэння групы здароўя.

Да 80 працэнтаў немаўлят у Беларусі — здаровыя і атрымліваюць 8 балаў праз 1 хвіліну і 8—9 балаў праз 5 хвілін пасля з'яўлення на свет (ад 0 да 7 балаў праз хвіліну пасля нараджэння атрымліваюць апошнімі гадамі каля 3 працэнтаў). 10 балаў сустракаецца рэдка. Колькасць дзяцей з нізкай ацэнкай па шкале Апгар апошнімі гадамі змяншаецца дзякуючы арганізацыі перынатальнай дапамогі, укараненню абсталявання высокага класа, новых метадаў прагназавання, лячэння і прафілактыкі захворванняў у цяжарных і нованароджаных, павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў у радзільнях.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** protas@zviazda.by

■ Інавацыі

# Для выратавання... «уключаем» імунітэт

**Шматфункцыянальныя ветэрынарныя прэпараты для лячэння і прафілактыкі хвароб сельскагаспадарчых і дамашніх жывёл распрацавалі ў БДУ.**

Новыя лекавыя сродкі з'яўляюцца інавацыйнымі фармацэўтычнымі прэпаратамі і не маюць замежных аналагаў. У ветэрынарыі з'явіліся тэрапеўтычныя сродкі, якія ўздзейнічаюць не на інфекцыйны фактар — вірусы, бактэрыі, грыбы, унутрыклетачных і пазаклетачных паразітаў, а на інфіцыраваны арганізм, падаючы сігнал аб узнікшых праблемах і тым самым мабілізуючы ўласныя ахоўныя механізмы жывёл.

Дзеючымі рэчывамі ў новых прэпаратах сталі бялковыя малекулы, якія атрымліваюць біятэхналагічным спосабам, але яны цалкам ідэнтычныя прыродным. Новыя медыкаменты дазваляюць адначасова праводзіць лячэбныя і прафілактычныя мерапрыемствы. Прынцыпы прымянення іх у тэрапіі цалкам адпавядаюць прынцыпам арганічнага харчавання і не наносяць шкоды ні жывёлам, ні спажыўцам жывёлагадоўчай прадукцыі.

Да таго ж, ім уласцівы адначасова імунамадулюючая, супрацьвірусная, супрацьгрыбковая, антыпаразітарная і антыбактэрыяльная актыўнасць. Таксама медыкаменты аказваюць антыстрэсавае дзеянне, плённа ўплываюць на рэпрадуктыўныя функцыі жывёл, павялічваюць напружанасць і працягласць імунітэту пры вакцынацыі, скарачаюць час лячэння ў 2-3 разы, «уключаюць» імунныя працэсы ўжо праз 6-12 гадзін пасля ін'екцыі, дазваляюць захаваць пагалоўе захварэлых на 95% і больш.

Яшчэ адна перавага новых ветэрынарных прэпаратаў — адсутнасць неабходнасці «вытрымліваць паўзу» па малочнай і мясной прадукцыі пасля прымянення ў жывёл медыкаментаў.

Цяпер распрацавана лінейка прэпаратаў для прафілактыкі і лячэння асобна для кожнага віду жывёл: для буйной рагатай жывёлы, свіней, коней, для дамашніх жывел, у тым ліку для лячэння сабак, катоў, пушных звяроў, трусоў... Прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю і зарэгістраваны больш за 20 прэпаратаў і 40 субстанцый.

Новыя ветэрынарныя прэпараты распрацаваны супрацоўнікамі кафедры мікрабіялогіі і лабараторыі біятэхналогій біялагічнага факультэта БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры прафесара Уладзіміра Пракулевіча.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** nikalaeva@zviazda.by

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

19 СТУДЗЕНЯ 2017 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15809)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года


Імёны

## Мікіта ЦЫРКУН:
# «Гонкі адмяняюць толькі ў шторм»

**Мікіта Цыркун стаў адным з самых маладых спартсменаў у нашай дэлегацыі на Алімпіядзе ў Рыа. У свае 19 ён здабыў пуцёўку на Гульні і ўвайшоў у 30 самых лепшых віндсерфінгістаў свету, што зусім нядрэнна для прадстаўніка краіны, якая не мае выхаду да мора. У дзяцінстве хлопец сур'ёзна захапляўся шахматамі, адчуваў цягу да дакладных навук, а цяпер скарае хвалі. Мікіта ўжо стаў чэмпіёнам свету сярод юніёраў па віндсёрфінгу ў класе «RS:X», на Алімпіядзе заняў 22-е месца, наступная мэта — Гульні ў Токіа. Пра тое, як праходзілі спаборніцтвы ў бразільскім Гуанабара, з якімі марскімі жыхарамі даводзіцца сустракацца падчас гонак, і што цэніць у кнігах і фільмах Мікіта Цыркун, ён расказаў у інтэрв'ю нашаму карэспандэнту.**

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***




Медыяпрастора

# ДЗЕЦІ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

## Пакаленне Z: малюнкі замест слоў, «лайкі» і віртуальная рэчаіснасць

**Ён амаль не карыстаецца гарадскім тэлефонам, не памятае нумары сяброў. Не піша ад рукі, а звыкла набірае тэксты на клавіятуры. Кожны дзень карыстаецца камп'ютарам, планшэтам, смартфонам і даволі часта прыстаўкай для гульняў. Дрэнна запамінае, бо вырас у асяроддзі, дзе пра ўсё можна даведацца ў сеціве, але адначасова можа паспяхова выконваць некалькі задач. Лепш разумее вобраз, чым словы, бо сталеў ва ўмовах дэматыватараў, інфаграфікі, фота равеснікаў і коцікаў. Мае сотні сяброў у сацыяльных сетках, аднак не засяроджваецца на трывалых адносінах і лёгка развітваецца з «фрэндамі», калі адчувае сябе некамфортна. Галоўная яго матывацыя — цікаўнасць: калі яму не цікава — нічога не будзе рабіць, таму што ў яго ёсць усё (бацькі забяспечылі). Ён не амбіцыйны, але прызвычаіўся да пахвалы, «лайкаў» і рэпостаў.**

— Звычайна, пачынаючы заняткі па медыяадукаванасці, я прапаную сваім калегам вызначыць па гэтых характарыстыках, пра каго ідзе размова? І чую ад іх самыя розныя адказы: ад нейтральных «гэта нашы школьнікі» да агрэсіўных: «...нейкія непаўнацэнныя людзі». Між іншым, гэта ўсяго толькі характарыстыка пакалення Z, — расказвае **настаўнік фізікі жодзінскай гімназіі №1 Эла ЯКУБОЎСКАЯ.**

У рамках Рэспубліканскага каляндарнага фестывалю прафесійнага майстэрства педагогаў яна разам са сваім калегам і мужам **Аляксандрам ЯКУБОЎСКІМ** (Аляксандр Уладзіміравіч выкладае фізіку ў Жодзінскай жаночай гімназіі, абодва маюць кваліфікацыйную катэгорыю «настаўнік-метадыст» і ўваходзяць у Асацыяцыю настаўнікаў метадыстаў «Імкненне». — **Аўт.**) правялі майстар-клас па медыяадукацыі для калег, каго цікавіць гэта тэма.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***




Пазнаёміцца з прафесіяй

# Чаго няма нават у Грэцыі,

## ці Разгледзець радзіму здалёк

**Сачыць за жыццём Ірыны МІЛАШЭЎСКАЙ у сеціве — адно задавальненне: амаль кожны тыдзень у яе профілі ў «Інстаграме» з'яўляюцца новыя фотаздымкі з розных краін і гарадоў. Але гэта не кадры з адпачынку, проста дзяўчына ўжо шосты год працуе кіраўніком турыстычных груп у турах па ўсёй Еўропе, цікавыя фота — ні што іншае, як кадры працоўных момантаў. Я распытала Ірыну пра тое, як ёй удалося ўладкавацца на работу-мару, пра беларускіх турыстаў і не толькі.**

***— У свае 23 гады ты ўжо спецыяліст з сур'ёзным стажам у такой далёка не лёгкай прафесіі...***

— Я заўсёды прытрымлівалася таго пункту гледжання, што чалавек, якому споўнілася 18 гадоў, ужо самастойны, а гэта значыць, што ён павінен зарабляць сам і, пажадана, дапамагаць бацькам, а не сядзець у іх на шыі. Калі вучылася на другім курсе гуманітарнага факультэта БДУ, адчула, што атрымліваць веды, вучыцца, канешне, добра, тым не менш забяспечваць сябе таксама неабходна. Таму вырашыла паўдзельнічаць ва ўсім вядомай праграме «Work and Travel» і паехаць у Амерыку. Падчас падрыхтоўкі аднойчы выпадкова ўбачыла аб'яву аб тым, што ідзе набор студэнтаў, якія хацелі б паспрабаваць свае сілы, працуючы ў Грэцыі з турыстамі. Вырашыла адправіць заяўку і сюды. Як высветлілася пазней, было пададзена 150 рэзюмэ, на падставе якіх адабралі і запрасілі на гутарку 50 кандыдатаў. Конкурс быў жорсткі: білеты да Грэцыі атрымалі толькі трое, у тым ліку і я. Так вызначыліся мае планы на бліжэйшыя паўгода.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***



**Рэдкі кадр падчас работы ў Парыжы: без групы на заднім плане.**

Ад рукі

# НАПІШЫ ЛІСТ...

## Генеральнаму сакратару ААН

**У лютым стартуе Беларускі маладзёжны конкурс сачыненняў эпісталярнага жанру. Асноўная яго мэта — адраджэнне традыцый напісання твораў як самастойнай творчай працы, павышэнне ўзроўню пісьменнасці моладзі, дзякуючы ўменню выказваць свае думкі, перадаючы ўсе адценні, стымуляванне творчых здольнасцяў і ўдасканаленне моўных ведаў вучняў.**



Мерапрыемства праводзіцца ў рамках Міжнароднага маладзёжнага конкурсу сачыненняў эпісталярнага жанру пад эгідай Сусветнага паштовага саюза. Яго арганізатарамі выступілі Белпошта сумесна з Міністэрствам адукацыі.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца навучэнцы ўстаноў адукацыі ва ўзросце да 15 гадоў. Ім трэба будзе прадставіць сачыненне на тэму «Уяві, што ты дарадца новага Генеральнага сакратара ААН. Якую глабальную праблему ты дапамог бы яму вырашыць у першую чаргу? Якую даў бы параду, каб ён справіўся з рашэннем?»

Конкурс праводзіцца ў два этапы: абласны (з 1 лютага па 1 сакавіка) і рэспубліканскі (прыём твораў-пераможцаў абласнога этапу — да 15 сакавіка). Сачыненні павінны быць напісаны ад рукі на беларускай ці рускай мове, у форме ліста і ўключаць тры асноўныя элементы, такія як дата, форма прывітання-развітання, подпіс. Гэта павінна быць праца, напісаная спецыяльна для ўдзелу ў конкурсе, якая ніколі раней не друкавалася. У творах павінна строга выконвацца зададзеная тэма. Аб'ём не павінен перавышаць 1000 слоў. Паэтычныя тэксты не прымаюцца.

Кожны ўдзельнік мае права прадставіць на конкурс толькі адну работу. Тэрытарыяльныя органы адукацыі вызначаюць па адным лепшым сачыненні ад кожнага раёна, горада, абласнога цэнтра і Мінска і перадаюць іх у абласныя філіялы РУП «Белпошта» і на «Мінскую пошту».

Асноўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных работ — адпаведнасць сачынення заяўленай тэме і глыбіня яе асвятлення, захаванне ў сачыненні характэрыстык эпісталярнага жанру, мастацкая своеасаблівасць і моўнае афармленне, арыгінальнасць і індывідуальны творчы падыход, агульнае чытацкае ўспрыманне тэксту сачынення.

Па выніках другога этапу будуць прысуджацца адно першае, два другія і чатыры трэція месцы.

Абвяшчэнне вынікаў і заахвочванне ўдзельнікаў рэспубліканскага этапу конкурсу адбудзецца на ўрачыстым мерапрыемстве, прысвечаным Дню радыё і сувязі ў маі 2017 года. Работа пераможцы будзе накіравана ў Берн (Швейцарыя), для ўдзелу ў 46-м Міжнародным конкурсе сачыненняў эпісталярнага жанру.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ДЗЕЦІ МУЛЬТЫМЕДЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ФЕНОМЕН ДЗІЦЯЧАЙ ШМАТЗАДАЧНАСЦІ

Тэорыю пакаленняў распрацавалі Вільям Штраўс і Нэйл Хоўв. Яны вызначаюць пакаленне як сукупнасць людзей, народжаных у прамежак часу, які складае прыкладна 20 гадоў. Гэта людзі, якія выхоўваліся пад уздзеяннем адных і тых жа падзей, з падобнымі каштоўнасцямі.

— Згодна з іх тэорыяй, да пакалення Z адносяцца тыя, хто нарадзіўся пасля 2003 года. Пра іх яшчэ кажуць «народжаныя лічбавай рэвалюцыяй». Яны выраслі ў эпоху сацыяльных сетак і не ўяўляюць свайго жыцця без лічбавых гаджэтаў. Інтэрнэт успрымаюць як натуральнае асяроддзе пражывання. 90% з іх штодня карыстаюцца прыладамі камунікацыі і сацыяльнымі сеткамі. Іх сацыялізацыя адбываецца ў сеціве, тады як бацькі ў іх узросце мелі асабістыя стасункі. Псіхолагі сцвярджаюць, што ў іх іншы тып мыслення, па-іншаму функцыянуе памяць. Сярэдняя працягласць канцэнтрацыі ўвагі ў параўнанні з тым, што было 10—15 гадоў назад, зменшылася ў дзясяткі разоў, — падкрэслівае Эла Якубоўская. —У прадстаўнікоў пакалення Z — кліпавае мысленне і ўспрыманне свету. Яны гіперактыўныя і схільныя да аўтызацыі (любяць заставацца сам-насам). Дзеці мультымедыйных тэхналогій засяроджаны пераважна на кароткатэрміновых мэтах, хутчэй сталеюць, займаючыся самаадукацыяй у інтэрнэце. Нават маркетолагі заўважылі, што дзеці з малодшых класаў не жадаюць насіць футболкі з качанятамі і гуляць з Барбі. Пры гэтым шалёнай папулярнасцю карыстаецца сайт «Віртуальны свет Барбі», дзе можна самастойна прыдумляць свой уласны вобраз лялькі.

Для іх уласцівы феномен дзіцячай шматзадачнасці. Седзячы за камп'ютарам, дзіця адначасова кантактуе ў чаце, займаецца пошукамі ў сеціве, спампоўвае музыку, спрабуе рабіць дамашняе заданне і пры гэтым п'е сок ці жуе бутэрброд. Ім трэба шмат убачыць, зрабіць, на многае адрэагаваць. Шматзадачнасць прымушае працаваць іх мозг у іншым рэжыме, павышаецца хуткасць псіхічных працэсаў. І ўсё гэта трэба ўлічваць пры іх навучанні і выхаванні. Але ці заўсёды мы гэта робім? Да таго ж у школе сёння прадстаўлены два пакаленні: вучні старшых класаў — пакаленне Y і «зэты».

## ВУЧОБА СА «СКОКАМІ І БУБНАМІ»

Навукоўцы раяць: для таго, каб вучыць пакаленне Z, трэба казаць коратка. Вусную задачу трэба ўцісну́ць у 25 слоў, а потым разгорнута патлумачыць яе пісьмова і па пунктах. Кожны пункт таксама павінен складацца не больш, чым з 25 слоў. Пісьмовая задача дапамагае прыгадаць нюансы. Пакаленне Z дрэнна запамінае, таму што яго прадстаўнікі раслі ў асяроддзі, дзе ўсё можна ўдакладніць у інтэрнэце.

**«Дзяцей сёння трэба вучыць не толькі правілам дарожнага руху, але і таму, як арыентавацца ў інфармацыйных плынях».**

**Малюйце.** Пакаленне Z лепш успрымае вобразы, чым словы. Яны хутчэй зразумеюць «карту», а не пералік пунктаў.

**Стаўце «лайкі».** Пакаленне Z не можа працаваць без «пагладжванняў». Пахвала і ўзнагароды не матывуюць пакаленне Z, але іх адсутнасць выбівае іх з каляіны.

**Не адбірайце гаджэты.** Лепш фармулюйце задачы, выкарыстоўваючы розныя сэрвісы і праграмы, змяняйце інструменты, выкарыстоўвайце як мага больш тэхналогій. Не пазбаўляйце магчымасці выкарыстання сацыяльных сетак.

**Вучыце, гуляючы і развіваючы.** Прадстаўнікі пакалення Z не жадаюць, каб іх вучылі, але... вельмі любяць вучыцца. Пакаленне Z прызвычаілся да забаў з дзяцінства, бо інфармацыю ім падавалі са «скокамі і бубнамі».

Нягледзячы на тое, што пакаленне Z літаральна жыве ў інтэрнэце, карыстаецца лічбавымі прыладамі лепш за бацькоў і настаўнікаў, **яго прадстаўнікі не заўсёды разумеюць, якому кантэнту можна давяраць.** Паводле апошніх даследаванняў Стэнфардскага ўніверсітэта, падлеткі не могуць адрозніць рэкламныя матэрыялы ў СМІ ад класічных навін. Навукоўцы хацелі высветліць, як вучні ацэньваюць інфармацыю з вэб-сайтаў. Эксперты апыталі каля 8 тысяч навучэнцаў сярэдніх школ і каледжаў. Высветлілася, што 82% з іх не бачаць розніцы паміж аплачаным кантэнтам і звычайнымі тэкстамі. Як правіла, вучні арыентаваліся на тое, ці былі да артыкула прымацаваныя вялікія яркія малюнкі, а не на крыніцу інфармацыі. Пры пошуку якіх-небудзь звестак па тэме вучні цытуюць першы тэкст, які трапіўся ім на вочы, не клапоцячыся пра тое, каб праверыць і прааналізаваць дакладнасць і праўдзівасць яго зместу.

**Для таго, каб вучыць пакаленне Z, трэба казаць коратка. Вусную задачу трэба ўцісну́ць у 25 слоў.**

«Вось чаму дзяцей сёння трэба вучыць не толькі правілам дарожнага руху, але і таму, як арыентавацца ў інфармацыйных плынях. І тыя, і іншыя веды вельмі актуальныя для забеспячэння бяспекі новага пакалення, — падкрэслівае Эла Якубоўская. — Калі мы даём нашым вучням заданне — падрыхтаваць рэферат, як вы думаеце, куды па інфармацыю звернуцца нашы дзеці? Канешне, у інтэрнэт, але ці будуць яны правяраць здабытую такім спосабам інфармацыю? Прызнаемся, што нават мы, дарослыя, не заўсёды ўмеем гэта рабіць».

## ДЫЛЕМА: ДАВЯРАЦЬ ЦІ ПРАВЯРАЦЬ?

— Уменне крытычна аналізаваць інфармацыю ў інтэрнэце можна адпрацоўваць на звычайных школьных уроках, — упэўнены **Аляксандр ЯКУБОЎСКІ.** — А недакладныя звесткі сустракаюцца не толькі ў інфармацыйна-забаўляльнай сферы, але і ў адукацыйнай, напрыклад у розных банках рэфератаў, якімі так любяць карыстацца нашы школьнікі. Давяраць у сусветнай павуціне можна афіцыйным энцыклапедыям і слоўнікам. Але ў той жа час варта ўлічваць наступны момант. Вялікую папулярнасць апошнім часам набыла «Вікіпедыя» — свабодная энцыклапедыя. Інфармацыя, апублікаваная ў ёй, цалкам можа аказацца недакладнай, паколькі доступ да рэдагавання артыкулаў мае любы ахвотны — ад навуковага супрацоўніка да навучэнца пачатковай школы. Выкарыстоўваць «Вікіпедыю» для азнаямлення з матэрыяламі па тэме, якая зацікавіла вучня, можна, але не нельга ўспрымаць у ролі эксперта. Калі няма неабходнасці дэталёва вывучыць тэму, то «Вікіпедыя» падыдзе. Што па-сапраўднаму карысна ў ёй, дык гэта спіс крыніц унізе артыкула. Можна паглядзець на іх і вырашыць для сябе, ці варта ім давяраць. Пачытаць гэтыя крыніцы, каб убачыць інфармацыю ў кантэксце. Калі фрагменты звестак цытуюцца недакладна, быць напагатове. Пасля таго як азнаёміліся з тэмай на «Вікіпедыі», можна пашукаць больш падрабязныя звесткі, а для пошуку выкарыстоўваць ключавыя словы, прыведзеныя ў артыкуле са свабоднай энцыклапедыі.

Педагог звяртае ўвагу на тое, што большасць падлеткаў у першую чаргу рэагуюць на навіну, якая суправаджаецца прыгожай карцінкай. Існуе нямала рэсурсаў, здольных дапамагчы правесці аператыўную праверку малюнкаў на дакладнасць. Напрыклад, **Findexif.com —** бясплатны сэрвіс, на які можна загрузіць фатаграфію ці даць спасылку на яе. Ён вызначыць, калі было зроблена фота, якой прыладай, параметры вывы, часам можна вызначыць і месца здымак.

**FotoForensics —** сайт, які дазваляе знайсці ўстаўленыя ў фатаграфію пры рэдагаванні фрагменты. Пасля апрацоўкі праграма выдае здымак, дзе змененыя вобласці будуць вылучацца на фоне іншых.

**Google Search by Image, пошук у «малюнках» Яндэкса і праграма TinEye.** Сюды можна загрузіць фота ці малюнак, каб знайсці яго арыгінальную крыніцу і паглядзець, дзе яны яшчэ друкаваліся.

Аляксандр Якубоўскі раіць і педагогам, і школьнікам выкарыстоўваць наступныя фармальныя індыкатары для вызначэння дакладнасці інфармацыі.

**Надзейнасць крыніцы.** Наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі. Даволі часта ў інтэрнэце ідзе передрукоўка звестак з аднаго сайта на іншыя. Чым больш спасылак на зыходны матэрыял знаходзіцца ў сеціве, тым вышэйшы яго аўтарытэт сярод іншых рэсурсаў.

**«Сярэдняя працягласць канцэнтрацыі ўвагі ў параўнанні з тым, што было 10—15 гадоў назад, зменшылася ў дзясяткі разоў».**

**Аўтарства.** Для таго каб зразумець, ці варта давяраць якому-небудзь артыкулу, можна пашукаць інфармацыю аб статусе і кампетэнтнасці яе аўтара. Напрыклад, азнаёміцца з іншымі яго працамі, каментарыямі і водгукамі чытачоў. Калі аўтар артыкула мае добры журналісцкі вопыт або навуковую ступень, то шанцы на праўдзівасць яго довадаў узрастаюць. Акрамя таго, у інтэрнэце можна пашукаць яго блогі, старонкі ў сацыяльных сетках і іншыя звесткі, якія дапамогуць скласці меркаванне пра аўтара.

**Якасць падачы інфармацыі.** Інфармацыя падаецца пісьменна, без мноства граматычных, сінтаксічных або пунктуацыйных памылак. Адпаведнасць фатаграфій або малюнкаў зместу сайта. Карыснасць прыведзеных ілюстрацый. Адпаведнасць назвы адраса сайта яго зместу. Спасылкі, размешчаныя на гэтым сайце, вядуць на іншыя карысныя рэсурсы.

*— Нават пры наяўнасці мабільных тэлефонаў і сацыяльных сетак законы Ньютана дзеці самастойна не засвояць, калі ім не раскажуць пра іх у школе.Таму наша задача — навучыць іх працаваць на ўроку фізікі з фізічнай інфармацыяй, якая сустракаецца ў розных медыякрыніцах, — падсумавала Эла Якубоўская. — І, самае галоўнае, не спрабуйце змяніць ваша дзіця. Прыміце як факт — яно іншае, у чымсьці лепшае за вас. Дапамажыце яму ўвайсці ў дарослае жыццё, падзяліцеся сваім вопытам і прыглядзьцеся больш уважліва — магчыма, вам таксама ёсць чаму ў яго павучыцца?*

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

*Дапытлівы розум*

# КРЭАТЫЎ У «КАРОТКІХ ШТОНІКАХ»

**Дзень дзіцячых вынаходак (Kid Inventors' Day) адзначылі ва ўсім свеце 17 студзеня.**

Свята прысвечана ўсім юным вынаходнікам, без якіх мы сёння не ведалі б пра водныя лыжы, крэсла-качалку, снегаход, батут, футравыя навушнікі, цацачны самазвал, мабільныя акумулятары і многія іншыя рэчы, якія даўно сталі для нас звыклымі. Датай святкавання быў абраны дзень нараджэння выдатнага амерыканскага дзеяча, вучонага, вынаходніка і журналіста Бенджаміна Франкліна. Сваю першую вынаходку — ласты для плавання — ён прыдумаў у 12 гадоў.

14-гадовы Джон Кон распрацаваў устройства Good Vibrations, якое дазваляе ператвараць гукавыя хвалі ў тактыльныя адчуванні. Дзякуючы яму людзі са слабым слыхам могуць адчуваць музыку. Гэтая ідэя прыйшла падлетку ў галаву, калі ён прыкладся зубамі да гітары. У 2012 годзе юны вынаходнік стаў пераможцам конкурсу Google Science Fair.

Самы багаты на сённяшні дзень чалавек планеты Біл Гейтс таксама пачынаў сваю кар'еру ў юнацтве. Свой першы буйны капітал у памеры 20 тысяч долараў ён зарабіў у 15 гадоў, калі стварыў праграму для рэгулявання дарожнага руху. А ў 17 гадоў Гейтс з сябрамі заснаваў сваю першую кампанію Traf-O-Data, якая займалася стварэннем лічыльнікаў дарожнага трафіку і складаннем справаздач для дарожных інжынераў.




Штогод больш за 500 тысяч дзяцей і падлеткаў вынаходзяць розныя гаджэты і гульні, ствараюць і мадыфікуюць робатаў і тэхніку. У Польшчы, у Варшаве, ужо больш за дзесяць гадоў працуе бюро патэнтаў на дзіцячыя вынаходкі. У Нідэрландах Інстытут Lego актыўна прыцягвае дзяцей у якасці экспертаў, паколькі лічыць дзіцячае крэатыўнае мысленне вельмі каштоўным для новых распрацовак.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Зялёны дэкор*

# Ажывіць... сцяну ў офісе

**Праект па стварэнні фітасцен пачынае рэалізоўваць студэнт факультэта эканомікі і кіравання Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы Януш ХАЦЯН.**



Упершыню ідэю па вертыкальным азеляненні сцен у офісах хлопец прадставіў на X Invest Weekend і атрымаў прыз за самы распрацаваны праект.

«Фітасцены папулярныя ў краінах, якія клапоцяцца пра экалогію, — тлумачыць Януш. — Перш за ўсё, гэта дзяржавы Заходняй Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Падобны дэкор сцен выкарыстоўваюць у сваіх офісах, напрыклад, такія фірмы, як National Geographic і Armani».

Фітасцяна ўяўляе сабой канструкцыю для вертыкальнага размяшчэння раслін альбо моху. На думку студэнта, такі дэкор не толькі ўпрыгожвае офісную прастору, але і дапамагае палепшыць якасць паветра і прыцягнуць кліентаў.

— Кампаніі і фірмы могуць такім чынам дадаткова папулярызаваць сябе праз сацыяльныя сеткі, выстаўляючы маляўнічыя фатаграфіі ў інтэрнэт, бо яркія колеры кідаюцца ў вочы і прыцягваюць увагу наведвальнікаў. Больш за тое, багацце раслінасці ў офісе павышае працаздольнасць і прадуктыўнасць супрацоўнікаў, — разважае аўтар праекта.

Акрамя Януша ў камандзе працуе студэнтка факультэта мастацтваў і дызайну ГрДУ. У будучыні яны разам плануюць зрабіць каталог з раслінамі, якія будуць пастаўляцца з Германіі, Францыі і Швейцарыі. Зараз студэнты працуюць са стабілізаваным мохам і непатрабавальнымі да нашых тэмпературных умоў раслінамі.

«Стабілізаваны мох — той, у якім выпампаваная вільгаць заменена адмысловым растворам. За такой раслінай патрабуецца асаблівы догляд спецыяліста, які раз на два месяцы замяняе яго. Затое такая фітасцяна здольная праслужыць доўгія гады», — падкрэслівае Януш.

Можна таксама стварыць фітасцяну з грунтам, але тады спатрэбіцца дадатковы каркас. Мох прымае любую форму, і з яго можна лёгка рабіць шары, фігуры, жывыя карціны.

Малады чалавек лічыць, што ў Гродне вертыкальным азеляненнем можна было б таксама ўпрыгожваць будынкі гіпермаркетаў. Лепшым прыкладам «вулічнай» фітасцяны ў абласным цэнтры студэнт лічыць увітую плюшчом сцяну галоўнага корпуса сваёй альма-матар.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




# КЛІК «У ЗАКОНЕ»

**Трапіць на лаву падсудных, не ўстаючы з-за камп'ютара, — і так можа быць. Пра гэта ведаюць ужо многія нашы суайчыннікі. Прычым некаторыя з іх нават не падазравалі, што робяць нешта супрацьпраўнае. Як, напрыклад, жыхар Гомеля, што захаваў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы ролік з разраду «хоум відэа». Падчас следства хлопец тлумачыў, што проста паглядзеў відэазапіс і не разумее, як той апынуўся на яго старонцы. Але праваахоўнікаў гэта не пераканала — аматара «гарачых»ролікаў асудзілі па артыкуле «Выраб і распаўсюджванне парнаграфічных матэрыялаў ці прадметаў парнаграфічнага характару».**

Трэба сказаць, што часам такое сапраўды адбываецца з-за банальнага няведання ці па выпадковасці. Вядома, у адказ можна каторы раз паўтарыць, што няведанне не пазбаўляе ад адказнасці. Вось і зямлячка згаданага хлопца, што пакінула пад падобным відэа каментарый «Фу, якая брыдота!», не задумалася, што ацэнены такім чынам запіс з'явіцца ў стужцы навін яе сяброў. Вынік — суд па аналагічным артыкуле. Абаім удзельнікам гісторый пашанцавала — яны адразу ж трапілі пад амністыю.

Падобныя выпадкі становяцца рэзанансднымі, і большасць беларусаў ужо, напэўна, прызвычаіліся паводзіць сябе ў сецціве як мага акуратней. Але адна з апошніх гісторый выбіваецца з гэтага шэрагу. Жыхарка Гродна бавіла час у адной з сацыяльных сетак і ўбачыла эратычнае (насамрэч, як пазней канстатуе мастацтвазнаўчая экспертыза, — парнаграфічнае) фота, якое ёй спадабалася. Націснула кнопку «Захаваць» і забылася на яго. А здымак трапіў у агульнадаступны альбом. У выніку — суд, два гады зняволення з адтэрміноўкай, канфіскацыя смартфона і штраф у 690 рублёў. Да ўсяго з-за інцыдэнту жанчыну звольнілі з работы, а рэпутацыя маладой мамы ў школе, дзе вучыцца яе дзіця, цяпер яўна не на самым высокім узроўні. Акрамя гэтага, гісторыяй зацікавіліся ў органах апекі...

Сёння ў сецціве натрапіць на выявы "для дарослых" можна абсалютна выпадкова. Неадноўчы чуў ад сваіх сяброў, якія працуюць у офісах, аповеды пра сітуацыі, калі ім даводзілася баязліва аглядвацца на суседзяў па кабінеце: ці не пабачылі яны чарговы непрыстойны банер, што выскачыў на сайце са звычайнымі навінамі (ёсць такія рэсурсы, што зарабляюць на скандальных матэрыялах, а пра якасць рэкламы не клапоцяцца)? Дарэчы, яны хвалююцца небеспадстаўна, бо калі глядзець на такія эпізоды з юрыдычнага боку, то гэтага супрацоўніка можна прыцягнуць да адказнасці за публічную дэманстрацыю парнаграфіі.

**З-за інцыдэнту жанчыну звольнілі з работы, а рэпутацыя маладой мамы ў школе, дзе вучыцца яе дзіця, цяпер яўна не на самым высокім узроўні.**

Ды што там навіны — аднойчы знаёмая папрасіла мяне вярнуць да жыцця яе камп'ютар, які... патрабаваў грошы быццам бы за прагляд «дарослага відэа». Пры тым што сама яна ніколі падобным кантэнтам не цікавілася. А рабілася ўсё быццам бы ад імя праваахоўных органаў. Ноўтбук адрамантавалі, і гісторыя скончылася хэпі-эндам, у адрозненне ад аналагічнага выпадку, у які трапіў жыхар Гродна. Мужчына шчыра паверыў, што яго ПК «рэквізавала» МУС, і прыйшоў у аддзяленне міліцыі з грашыма, каб аплаціць штраф, бо не ўмеў карыстацца электронным кашальком. Добра, што хоць інтэрнэт-махляры засталіся без прыбытку.

Прасторы сецціва становяцца сапраўдным «мінным полем», прайсці праз якое — задача для некаторых непасільная. Іншая справа, што датычыцца гэта не толькі эротыкі. Пакажы мне свае «лайкі» — і я скажу, хто ты: дзяўчына, што цытуе кнігі, якія не чытала, або хлопец, які замест рэальных стасункаў шукае «гарачыя» фота ў інтэрнэце. Варта заўважыць, што ад неразборлівасці асобных людзей у сецціве больш за ўсё цэрпяць пераважна іх жа знаёмыя, вымушаныя бачыць у стужцы навін тое, што прыйшлося даспадобы сябрам. Таму маё асабістае меркаванне — заканадаўчыя меры, магчыма, занадта строгія, бо ўсе аматары нізкапробнага кантэнту самі сябе рана ці позна караюць. А засцерагчыся ад усіх вышэйагучаных сітуацый пакуль што можна, здаецца, толькі адным спосабам — выхоўваць у сабе густ, каб адрозніваць прыгожае ад брыдкага.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Новы досвед*

# ЭКАЛАГІЧНАЯ ДРУЖАЛЮБНАСЦЬ?

## Гэта карысна, лёгка і весела

**На інтэрактыўнай выставе «Экатэхнум» можна выклікаць дождж рухам пальца, запаліць лямпачку без падключэння да электрасеткі і падняць сябе ў паветра адной рукой, нібы знакаміты барон Мюнхгаўзен. Займальныя фізічныя вопыты дазваляюць паверыць, што вырасціць можна любую задачу, нават калі гэта падаецца немагчымым на першы погляд.**

Выстава разлічана на дзяцей ад 10—12 гадоў. У будучыні арганізатары з Цэнтра экалагічных рашэнняў мяркуюць распрацаваць спецыяльную праграму для першакласнікаў. Пакуль жа эфект ад наведвання бачны на прыкладзе дарослых: спачатку насцярожаныя, яны ўжо праз дзесяць хвілін самі ахвотна мацаюць экспанаты і ўдзельнічаюць у даследаваннях, а праз паўгадзіны ўступаюць у дыспут з трэнерам Антонам Гаховічам.

— Многія адчуваюць сябе некамфортна, калі спрабуеш з імі пагаварыць на тэмы экалогіі. Чалавек чуе пра розныя праблемы: змену клімату, мадыфікаваныя прадукты харчавання, небяспечныя выкіды ў паветра, зямлю... Усе гэта без дастатковай інфармаванасці можа ператварыцца ў «страшылкі», балючыя тэмы, пра якія складана гаварыць і невядома як вырашаць. Наша задача не запалохаць, а растлумачыць, што пры дасведчаным падыходзе, пры ўнутраным самакантролі можна жыць у гармоніі з навакольным светам, быць дружалюбным да прыроды і пры гэтым не адмаўляцца ад сучасных магчымасцяў. Гэтая думка і рэалізаваная ў «Экатэхнуме». Мы перакананыя самі і хочам расказаць іншым, што ў экалагічна дружалюбных паводзінах няма нічога страшнага і складанага, наадварот, гэта карысна, лёгка, весела, — кажа **намеснік дырэктара па праграмнай дзейнасці Цэнтра экалагічных рашэнняў Дар'я ЧУМАКОВА.**

Вандроўка паміж стэндамі цягнецца крыху болей за гадзіну. Для дзяцей большую частку праграмы займаюць інтэрактыўныя гульні. Можна папрасіць і індывідуальны падыход, тады трэнер падрабязна спыніцца на цікавай для наведвальніка тэме. Хутка ў «Экатэхнуме» з'явіцца і аўдыягід. Арганізатар экскурсіі зможа ўключаць яго для групы альбо папярэдне праслухаць і пераказаць матэрыял.

— Сюды прыходзяць школьнікі, метадысты. Мяркую, дзецям куды цікавей апынуцца ў інтэрактыўнай лабараторыі, чым на ўроку экалагічнай бяспекі. Зацікавіліся новай формай адпачынку на выхадных і сем'і з малымі дзецьмі. На вандроўку паміж стэндамі запісваюцца кожны дзень, а працуе «Экатэхнум» пакуль бясплатна, у тэставым рэжыме, — расказвае Дар'я Чумакова. — Раней Цэнтр экалагічных рашэнняў працаваў толькі з мабільнымі выставамі, мы загружалі некалькі стэндаў у машыну і ехалі ў той куточак Беларусі, адкуль прыйшло запрашэнне. Упершыню такое мерапрыемства зладзілі каля шасці гадоў таму. На выездах было здорава, але нам заўсёды хацелася займець пастаяннае месца, дзе б маглі грунтоўна расказваць пра экалагічную дружалюбнасць. Сёлета разам з Рэспубліканскім цэнтрам інавацыйнай і тэхнічнай творчасці ідэю ўдалося ператварыць у паўнавартасны інтэрактыўны праект.

Каб увасобіць задуму, спатрэбілася паўгода. Тэма экалогіі занадта маштабная, каб змясціцца ў адной выставе, таму на стэнды трапілі толькі некаторыя аспекты «зялёнага» жыцця: энергазберажэнне і энергаэфектыўнасць, экалагічная дружалюбнасць, адходы і іх утылізацыя, узнаўляльная энергетыка... Падаецца, усяго пакрысе, але гэты набор, на думку арганізатараў, дае ўяўленне, што адбываецца ў навакольным асяроддзі і што мы можам зрабіць, каб не дапусціць няпрыемных змяненняў.

Адначасова з энтузіястамі Цэнтра экалагічных рашэнняў над выставай працавала дызайнер Людміла Шыдлоўская. Гэта яна ўпрыгожыла стэнды, аформіла інфармацыю ў выглядзе малюнкаў, каляровых схем. Яна ж ператварыла галоўных персанажаў выставы — Ваду, Сонца, Біямасу, Вецер — у супергерояў. Любы, хто прыходзіць на выставу, таксама быццам бы далучаецца да каманды самых магутных сіл у нашым свеце. Яны сваім выглядам нечым падобныя на вядомых мультыплікацыйных герояў, што павінна спадабацца малым наведвальнікам.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.** *yurgel@zviazda.by*

*Павесці за сабой*

# Першыя на шляху да мэты

## Аб жыцці лідараў-актывістаў пасля ВНУ

**У кожнай навучальнай установе абавязкова знойдуцца хлопцы і дзяўчаты, якіх называюць актывістамі. Хто яны такія і чым займаюцца, тлумачыць не трэба. А вось што адбываецца з маладымі людзьмі пасля заканчэння вучобы, мала хто ведае. Мы папрасілі былых студэнцкіх лідараў прыгадаць сваё нядаўняе жыццё і расказаць, ці дапамагае ім досвед, набыты ў тыя часы.**

### Знайсці другую палавінку

Юлія Столяр, выпускніца факультэта міжнародных адносін БДУ 2015 года, прызналася, што ў студэнцкае самакіраванне імкнулася трапіць галоўным чынам дзеля таго, каб атрымаць месца ў інтэрнаце. Дзяўчына з першых месяцаў вучобы старалася быць актыўнай: хадзіла на ўсе магчымыя мерапрыемствы, малявала плакаты, насценгазеты і інш.

— Калі мне прапанавалі далучыцца да грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка БДУ, тут жа згадзілася. Памятаю, нібыта гэта было ўчора, як мне далі першае заданне — напісаць матэрыял пра сустрэчу студэнтаў з тагачасным трэнерам БАТЭ Віктарам Ганчарэнкам. Было незвычайна спрабаваць свае сілы ў якасці журналіста (па спецыяльнасці я эканаміст-перакладчык), тым больш што адчувала: у мяне атрымліваецца. У тым годзе інтэрнат мне так і не далі, але ў службе мне спадабалася...

Студэнцкае самакіраванне «зацягнула» Юлю на тры гады, два з паловай з якіх яна была старшынёй грамадскай інфармацыйнай службы. Паралельна некаторы час дзяўчына з'яўлялася галоўным рэдактарам факультэцкага выдання «ФМА-анлайн». Па факце і там, і там Юля шукала людзей, якія хацелі б пісаць тэксты, здымаць фота і відэа, рабіць афішы. Размяркоўвала заданні, а пасля кантралявала іх выкананне. Яна прызнаецца, што досведу ў гэтай справе дагэтуль не мела і толькі падчас працы вучылася матываваць, заахвочваць і... крытыкаваць калектыў.

— Некаторыя хлопцы і дзяўчаты, з якімі мы разам былі ў грамадскай інфармацыйнай службе, пасля выпуску працягваюць свой журналісцкі шлях, працуючы карэспандэнтамі, фатографамі, відэааператарамі ўжо на больш сур'ёзным узроўні, хоць і вучыліся на факультэтах, ніяк не звязаных з гэтай сферай. Я зрабіла выбар на карысць работы па спецыяльнасці, таму пакуль не магу сказаць, што досвед, атрыманы ў студэнцтве, карысны для мяне ў прафесійным плане. Затое ён дапамагае мне па жыцці, — кажа Юля. — Азіраючыся назад, я разумею, што ні за што б не выкрасліла самакіраванне са свайго студэнцтва. Дзякуючы яму адбылося шмат знаёмстваў з цудоўнымі людзьмі, з якімі я сябрую і цяпер. А за аднаго з іх я зусім нядаўна выйшла замуж!

### Дадатковы аргумент для наймальніка

Ірына Дораш атрымала дыплом БДУІР толькі летась. Малады спецыяліст прызнаецца, што яшчэ не зусім адышла ад студэнцкіх спраў: «Я пастаянна падтрымліваю сувязь са сваімі былымі калегамі па студсавеце, пытаюся ў іх што ды як. Яны таксама час ад часу просяць парады. Мне не хапае каманды, не хапае абмеркаванняў, ідэй, ініцыятыўнасці. Нідзе больш не знайсці столькі энергічных і натхнёных людзей, як у студэнцкім самакіраванні».

Іра прыгадвае, што пастаянна знаходзілася ў пошуках новых, незвычайных заняткаў для сябе. Дзяўчына была кіраўніком валанцёрскай групы БДУІР «Сузор'е», пасля ўзначальвала студсавет універсітэта, а калі з'явіўся грамадскі рэспубліканскі студэнцкі савет пры міністры адукацыі, далучылася і да яго. Па словах Іры, адным з самых цяжкіх у плане падрыхтоўкі і ў той жа час самым цікавым праектам, над якім ёй даводзілася працаваць, стала першая міжнародная студэнцкая канферэнцыя па самакіраванні. «Затое як класна было аб'яднаць столькі моладзі з розных гарадоў!»

— Падчас удзелу ў студсамакіраванні я навучылася знаходзіць агульную мову са студэнтамі, выкладчыкамі і адміністрацыяй свайго ўніверсітэта, акрамя таго, даволі часта ўзаемадзейнічала з прадстаўнікамі іншых ВНУ і арганізацый. Гэта дазволіла мне развіць упэўненасць у сабе, знікла боязь кантактаў з незнаёмымі людзьмі. Упэўнена, што спатрэбіцца ў далейшым і досвед публічных выступленняў, і ўменне аргументавана адстойваць свой пункт гледжання. Як мне здаецца, студэнцкае самакіраванне дае цудоўны шанц рэалізаваць сябе па спецыяльнасці яшчэ да выпуску з універсітэта. Мая прафесія — маркетолаг, і я ўжо паспела пераканацца: шмат якія з цяперашніх працоўных абавязкаў выконвала і дагэтуль.

Іра расказвае, што калі ўладкоўвалася на працу, пазначала ў рэзюмэ, што мела дачыненне да студэнцкага самакіравання. На гутарцы ў арганізацыі гэтым фактам зацікавіліся, пыталіся, чым канкрэтна займалася, якіх поспехаў дасягнула. «Канешне, у першую чаргу глядзяць на прафесійныя навыкі, але і студэнцкі досвед без увагі не пакідаюць. Таму не саромейцеся і пры працаўладкаванні заўсёды пра яго кажыце, лішнім дакладна не будзе», — раіць дзяўчына цяперашнім студэнцкім лідарам, у якіх выпуск яшчэ наперадзе.

### Валанцёрства — школа людскасці

Максім Бялец, будучы студэнтам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, не абмяжоўваў сябе адным кірункам: меў дачыненне і да студсавета, і да БРСМ.

— Надзвычай важным для мяне стаў удзел у валанцёрскай арганізацыі «Сябра дзяцей». Кожны Новы год мы ставілі казкі, збіралі гуманітарную дапамогу для выхаванцаў Журавіцкага дома-інтэрната. Малявалі дэкарацыі, стваралі касцюмы, рэпеціравалі да дзясятай гадзіны вечара! Затое дзень выступлення на сцэне інтэрната заўсёды быў запамінальным.

Праз валанцёрскую арганізацыю Максім упершыню трапіў у інтэрнат. Ён мяркуе, што далёка не кожны гатовы да стасункаў з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. «У нас, студэнтаў-валанцёраў, ніякай боязі не было, магчыма, таму, што мы бачылі: дзеці цягнуцца да нас, заўсёды чакаюць сустрэчы». Максім тлумачыць, што валанцёрства зрабіла яго не жаласлівым чалавекам, а, наадварот, больш моцным, дазволіла перагледзець уласныя магчымасці.




**Ірына Дораш падчас вучобы *(у цэнтры).***

Нават летам, калі студэнцкія справы заціхаюць у сувязі з канікуламі, хлопец не адпачываў на канапе:

— У 2014 годзе падчас правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў нашым універсітэце быў арганізаваны студэнцкі атрад «Дэльта», — расказвае хлопец. — А годам пазней мне давялося стаць камісарам сэрвіснага атрада імя Ілы Катуніна ва Усерасійскім дзіцячым цэнтры «Арляня». Там атрымалася не толькі папрацаваць, але і адпачыць на моры. Цудоўная магчымасць з мінімальнымі фінансавымі выдаткамі.

Цікава, што такая актыўная дзейнасць не пасунула вучобу хлопца на другі план: Максім з'яўляецца аўтарам пятнаццаці навуковых публікацый і мае дыплом з адзнакай.

### Уменне ствараць каманду

Аляксандр Сянчук за сем гадоў у студэнцкім самакіраванні прайшоў літаральна ўсе ступені: ад старасты паверха ў інтэрнаце Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта да намесніка рэспубліканскага студэнцкага савета БРСМ. Аднак немагчыма вучыцца вечна. Аляксандр, які мае два дыпломы аб вышэйшай адукацыі, сёння працуе намеснікам генеральнага дырэктара «Брэстаблаўтатранс» — дырэктарам філіяла «Аўтавакзал г. Брэста».

— У студсаветах я навучыўся кіраваць людзьмі, якія працуюць за ідэю, а таксама вырашаць пытанні з вышэйстаячым кіраўніцтвам. Але галоўнае, што мне дало студэнцкае самакіраванне, — гэта ўменне падбіраць кадры і ствараць каманду.

І не паверыць хлопцу нельга, бо менавіта ён стаў ініцыятарам правядзення ў сваёй альма-матар студэнцкага форуму «Прывітанне, Універ!» Гэты праект накіраваны на знаёмства першакурснікаў з універсітэтам да 1 верасня, каб ім лягчэй было адаптавацца ў новым асяродку. Таму думаецца, што ва ўсіх, хто сёння прыходзіць працаваць у калектыў Аляксандра, не ўзнікае ніякіх праблем з адаптацыяй — такі кіраўнік дакладна ведае сакрэты добрай рабочай атмасферы.

...Відавочна, што студэнцтва актывіста насычана цікавымі падзеямі, знаёмствамі, яно сапраўды запомніцца на ўсё жыццё. З іншага боку, удзел у бясконцых мерапрыемствах і падрыхтоўка да іх забіраюць шмат часу, і тады паўстае пытанне: а вучыцца калі? Усё індывідуальна. Нехта намагаецца паспець паўсюль, забываючыся на сон і ежу. А хтосьці выбірае нешта адно, ахвяруючы іншым, і тут галоўнае — правільна расставіць прыярытэты, каб пазней не пашкадаваць.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута**
**журналістыкі БДУ.**



*Не вучобай адзінай*

# КАЛІ РУБЕЛЬ КАЛОРЫІ БЕРАЖЭ,

## ці Дзе «заправіцца» студэнту

**Студэнт, як вядома, вечна сонны і вечна галодны. Калі першае выправіць можна толькі адным спосабам — проста выспацца, то для другога існуюць розныя варыянты. Мы высветлілі, дзе і чым харчуюцца і колькі грошай трацяць на ежу студэнты сталічных ВНУ.**

Каб будучыя маладыя спецыялісты не марылі сябе голадам падчас заняткаў, амаль пры кожным універсітэце ёсць сталовыя. Аднак ці можна назваць іх студэнцкімі, калі ў час пік вялізныя чэргі тут стварае не стомленая ад лекцый моладзь, а работнікі з найбліжэйшых будоўляў, офісаў і вытворчасцяў, замаўляюць і першае, і другое, і кампот з дэсертам. У той час, як студэнты, якіх тут не так ужо і шмат, выбіраюць сабе нешта адно.

— Гэта, напэўна, звязана з тым, што сёння не кожны студэнт можа дазволіць сабе паўнацэнны абед у сталовай. Для прыкладу, 130 грамаў свініны, запечанай з памідорамі, у нас каштуе 3,7 рубля. Гэта самая дарагая пазіцыя ў меню. Кошт супу звычайна каля рубля, салаты бываюць ад сарака капеек, — расказвае загадчыца сталовай адной са сталічных ВНУ.

Запыталася ў сваіх знаёмых студэнтаў, як часта яны ласуюцца «сталоўскімі катлеткамі». Высветлілася, што чым старэйшы курс, тым радзей. Ужо на другі год навучання хлопцы і дзяўчаты пачынаюць задумвацца пра эканомію сродкаў. Акрамя адсутнасці грошай, яшчэ адна распаўсюджаная прычына не харчавацца ў сталовай — недахоп часу.

Пры ўсім гэтым ёсць студэнты, якія знаходзяць і грошы, і час, каб штодня хадзіць у сталовую. Напрыклад, чацвёртакурснік факультэта міжнародных адносін БДУ Раман Казак.

— Заўсёды бяру на першае суп, на другое — мяса. У сярэднім паход у сталовую абыходзіцца ў 5 рублёў, калі падлічыць, колькі выдаткоўваю на абеды за месяц, атрымліваецца не такая ўжо і маленькая сума, але для мяне важна харчавацца правільна і пры гэтым не траціць час на прыгатаванне ежы. У інтэрнаце, дзе я жыву, адна кухня на паверх, там не зусім зручна кулінарыць, — расказвае Рома.

Куды больш вабяць студэнтаў рэстараны сетак хуткага харчавання, колькасць якіх у сталіцы з кожным годам расце. У адным з такіх я амаль гадзіну назірала за наведвальнікамі, прыслухоўвалася да іх размоў і зрабіла выснову: у асноўным за столікамі сядзелі студэнты. «Як я люблю чызбургер!» — выдаў малады чалавек, на імгненне забыўшыся пра вучобу, аднак хутка зноў падключыўся да размовы пра семінарскія заняткі ў новага выкладчыка. Яркія інтэр'еры, гучная музыка і ў меню толькі модныя запазычаныя словы — здаецца, тут усё толькі для моладзі і створана. Усё, акрамя цэн.

— Сярэдні заказ студэнта — 5—6 рублёў, — паведаміў супрацоўнік аднаго з рэстаранаў, які і сам яшчэ вучыцца. — На такую суму ў нас не разгуляешся: выйдзе бургер (ці бульба фры), напой і дэсерт. Але для перакусу паміж парамі хопіць.

Разам з тым усё больш студэнтаў спрабуюць кулінарыць самастойна. Зусім не рэдкасць, калі на перапынку ва ўніверсітэце нехта дастане «ссабойку», дзе будзе і мяса, і каша, і салата. Такі варыянт самы танны для студэнта, але і самы няпросты, бо, як мінімум, трэба ўмець гатаваць, а, як максімум, пастаянна прачынацца раней, каб паспець «сабраць» ежу на дзень.

Дар'я Беразюк вучыцца на 4 курсе МДЛУ. Яна амаль не ходзіць у сталовыя і буфеты, а фастфуд есць толькі за кампанію раз у некалькі месяцаў. Дзяўчына харчуецца ў асноўным тым, што сама гатуе ў інтэрнаце. Так, па яе словах, прасцей і надзейней за ўсё сфарміраваць правільны рацыён, абапіраючыся на невялікі студэнцкі бюджэт:

— Ранкам — абавязковы сняданак. Звычайна гэта аўсяная каша, ёгурт ці амлет, зрэдку магу абысціся бутэрбродам з гарбатай/кавай. Бывае, перакусваю яблыкам ці бананам. Абедаю рысам з курыцай або каўбасой, салатай з сезоннай агародніны. Магу выпіць малака ці кефіру. Вячэра ў мяне лёгкая: тварог, хлябцы з сырам, чай. Стараюся харчавацца правільна, больш-менш сачыць за фігурай. Але вельмі люблю салодкае, час ад часу дазваляю сабе шакаладку, мармелад ці печыва, — дзеліцца дзяўчына. — За месяц на харчаванне ў мяне сыходзіць прыкладна 150—170 рублёў. Гэта пры тым, што я яшчэ і ад бацькоў прывожу прадукты.

Калі ты студэнт і заклапочаны тым, як паменшыць сумы, якія выдаткоўваеш на харчаванне, то спецыяльна для цябе мы падрыхтавалі наступныя парады:

1. Перад паходам у краму абавязкова складзі спіс таго, што будзеш набываць, і праглядзі ў інтэрнэце, якія зніжкі дзейнічаюць у супермаркетах. Можа якраз неабходныя табе пельмені ці крупы дзе-небудзь прадаюць па акцыі. Акрамя таго, некаторыя крамы ўвечары зніжаюць цэны на прадукцыю ў кулінарных аддзелах.

2. Не саромейся браць з сабой на вучобу ежу ў кантэйнерах, загадзя прыгатаваную дома. На перапынку паміж заняткамі абавязкова захочацца есці. Але ў цябе не ўзнікне спакусы бегчы ў буфет па булку ці да аўтамата па чыпсы.

3. На сезонных рынках можна набыць гародніну і садавіну ўдвая танней, чым у краме (толькі будзь пільным у выбары!). А на крыты Камароўскі рынак прывозяць хлеб, малочныя і мясныя прадукты з усіх беларускіх рэгіёнаў. Таму многія цэны тут ніжэйшыя за сярэднія па горадзе.

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса**
**Інстытута журналістыкі.**

# Чаго няма нават у Грэцыі...

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

На месцы першыя некалькі тыдняў праходзіла навучанне. Мы паглыблена вывучалі гісторыю і міфалогію, аб'ездзілі ўсю краіну, каб дазнацца як мага больш пра яе культуру і традыцыі. Для таго каб лепш адчуць усю спецыфіку, некалькі дзён было адведзена на знаёмства з работай так званых гатэльных гідаў (прадстаўнікоў турфірмы, што сустракаюць адпачывальнікаў у тым ці іншым гатэлі і суправаджаюць іх падчас усяго адпачынку). Таксама давялося паспрабаваць сябе ў ролі прадстаўніка фірмы ў аэрапорце, дзе мы сустракалі турыстаў з самалёта ў пачатку адпачынку, а напрыканцы праводзілі, дапамагаючы зарэгістравацца на рэйс. Але асноўная частка работы прысвячалася таму занятку, у якім я пасля і знайшла сябе, — кіраўнік групы. У такой якасці мы з калегамі адпраўляліся на розныя экскурсіі па Грэцыі: паднімаліся на Алімп, наведвалі старыя гарады, маляўнічыя астравы... За паўгода я атрымала каштоўны досвед і, самае галоўнае, навучылася ўзаемадзейнічаць з людзьмі ў якасці кіраўніка. А пасля закруцілася: я здала сесіі ва ўніверсітэце экстэрнам і на наступны год зноў паехала ў Грэцыю на работу.



З маленькай турысткай перад чэшскім замкам.

***— Два гады, праведзеныя там, — не такі кароткі тэрмін. Чаму вырашыла вярнуцца дадому?***

— Лічу, што чалавек імкнецца з'ехаць у іншыя краіны, пазнаёміцца з новымі людзьмі, каб запоўніць сваё жыццё. Такім юнацкім максімалізмам пакутавала і я. Былі моманты, калі планавала застацца ў чужой краіне, разглядала і Грэцыю, і Германію ў якасці варыянтаў для пераезду на ПМЖ. І толькі адпрацаваўшы за мяжой два гады, зразумела відавочную ісціну: твой дом там, дзе твае родныя. І я вярнулася, каб прапаноўваць якасныя паслугі сваім землякам. Прыемна адкрываць для людзей свет, паказваць, наколькі ён цікавы. Дагэтуль з задавальненнем езджу ў іншыя краіны, але яшчэ з большым задавальненнем вяртаюся дадому. Я зразумела, што прыстойны ўзровень жыцця трэба не шукаць, а выбудоўваць самому сваёй працай.

***— Напэўна, быў нейкі павучальны ўрок, які ты часта ўспамінала...***

— У 18 гадоў, апынуўшыся ў чужой краіне адна, без родных і блізкіх, я выразна зразумела: немагчымае — магчыма. Галоўнае, не баяцца. Ты можаш дасягнуць усяго, але толькі калі сапраўды гэтага хочаш. Было мноства выпадкаў, калі мяне адпраўлялі на незнаёмыя маршруты. Гэта жудасны стрэс: трэба хутка нешта вучыць, імгненна арыентавацца ў сітуацыі і не забываць, што ты адказны не толькі за сябе, а яшчэ і за 82 чалавекі, што сядзяць за тваёй спінай. Я стала не толькі камунікабельнай, але і стрэсаўстойлівай. Гэты досвед даў мне разуменне: няма таго, з чым ты не можаш справіцца, ёсць толькі тое, з чым не хочаш.

**...Па звестках за мінулы год, на тэрыторыі Беларусі зарэгістравана 1 364 турыстычныя арганізацыі, у якіх занята больш за 6 тысяч супрацоўнікаў. Дзякуючы іх намаганням за год за мяжой пабывалі 738 631 чалавек. Калі вы плануеце адпачыць за мяжой сёлета ці ў наступным годзе, спадзяюся, вам пашчасціць зрабіць гэта ў кампаніі такога ж улюбёнага ў сваю справу спецыяліста, як мая суразмоўца.**

***— Іра, праз цябе прайшло столькі людзей, ці можаш абагульніць вобраз беларускага турыста?***

— Канешне! Гэта самыя цярплівыя і міралюбівыя людзі *(смяецца)*! Я працавала і з украінскімі, і з расійскімі турыстамі. Ва ўсіх краінах нашы групы любяць больш за астатнія. Асабліва хочацца адзначыць, што беларусы сапраўды ўмеюць атрымліваць асалоду ад жыцця. Яны цікаўныя, актыўныя, імкнуцца як мага больш убачыць і паспрабаваць. І гэта самы правільны падыход да адпачынку ў еўрапейскіх краінах.

***— Ты пабывала ў розных краінах свету, многа бачыла. І калі вяртаешся дадому...***

— ...Час ад часу чую, што «чагосьці нам не хапае, нешта не так». Але, калі паглядзець навокал, адчуваецца, што з кожным годам краіна змяняецца ў лепшы бок. Просты прыклад. Далёка не ў кожным еўрапейскім горадзе пасля васьмі гадзін вечара можна знайсці адкрытую краму ці тую ж кавярню. У маім родным Мінску такога пытання не паўстае. Культурнае жыццё таксама на вышыні — прыемна бачыць столькі таленавітай моладзі. І я дакладна ведаю, што дзяржава падтрымлівае цікавыя ініцыятывы, менавіта таму кожныя выхадныя, асабліва летам, паўстае пытанне «куды б схадзіць», але толькі ў кантэксце таго, што цяжка выбраць сярод мноства варыянтаў бавлення часу. Пра прыгажосць нашай прыроды ў Еўропе ходзяць легенды. А кухня! Кожны раз, вяртаючыся з групай дамоў, я чую, што людзі за тыдзень паспелі засумаваць па бульбе.

**«Гэты досвед даў мне разуменне: няма таго, з чым ты не можаш справіцца, ёсць толькі тое, з чым не хочаш».**

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,
студэнтка VI курса
Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Знайсці сябе*

# КАЛІ ЗАМЕС — ПАЧАТАК СПРАВЕ,

## або Хто захоўвае айчынныя традыцыі хлебапячэння

**У сярэдзіне 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў сталіцы задумалі зрабіць па адмысловым рэцэпце гатунак хлеба, які адлюстроўваў бы і захоўваў нацыянальныя гастранамічныя асаблівасці і традыцыі. У выніку паездак у Прыбалтыку і знаёмства з сакрэтамі тамтэйшых майстроў на рынку з'явіўся «Нарачанскі» — першы ў Беларусі заварны хлеб, які за гэты час стаў сапраўдным сімвалам нашай краіны. Яго, як і амаль трыццаць гадоў таму, выпускаюць на ўсё тым жа 2-м сталічным хлебазаводзе. Цеставод Дар'я ДАЙЛІД працуе тут усяго трэці год, але менавіта яна адказвае за якасць «Нарачанскага», якая, па прызнанні супрацоўнікаў, больш за ўсё залежыць якраз ад спецыялістаў гэтай прафесіі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Дарэчы, сам «Хлебазавод №2» — найстарэйшы ў Мінску, ён вырас з невялічкай пякарні, якая з'явілася на левым беразе Свіслачы больш як сто гадоў таму. Па тэхнічным абсталяванні саступае сваім канкурэнтам, дзе карыстаюцца больш сучаснай тэхнікай, але супрацоўнікі лічаць гэта сваёй перавагай. Так, тут значна менш аўтаматыкі, але і хлеб на выхадзе атрымліваецца асаблівы, быццам дамашні. Некаторыя жартам кажуць, што ісці на працу не ў гуморы нельга — прадукцыя ў такіх работнікаў выходзіць не вельмі якасная.

— У восьмым класе мы былі з экскурсіяй на адным з мінскіх хлебазаводаў, і мне гэта праца падалася цікавай, — успамінае Дар'я. — Ужо праз год я пайшла вучыцца ў Дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж хлебапячэння, атрымлівала адукацыю па агульнай спецыяльнасці «пекар». Нас вучылі рабоце з абсталяваннем, расказвалі пра спецыяльныя тэхналогіі, сыравіну і матэрыялы, з якімі давядзецца працаваць. Два дні штотыдзень мы праводзілі на заводах, дзе вучыліся прымяняць свае веды, вядома, пад наглядам старэйшых калег. Аднойчы я трапіла на практыку на гэта прадпрыемства, мне спадабалася, таму тут жа засталася і па размеркаванні. Працавала на ўсіх тэхналагічных лініях, цяпер мне даверылі замес цеста для «Нарачанскага».

Працоўнае месца цеставода — невялікая платформа, на якой усталявана ёмістасць для замешвання цеста. У яе са спецыяльнага дазатара падаюцца інгрэдыенты будучага хлеба: жытняя і пшанічная мука, дрожджы, соль, цукар і іншыя, а таксама заварка з жытняй мукі, неферментаванага і ферментаванага соладу, бульбянога пюрэ, кмену і вады. Задача Дар'і — кіраваць працэсам замесу цеста. Гэта робіцца пры дапамозе спецыяльнай панэлі з кнопкамі. Пасля замешвання цеста паступае ў спецыяльную ёмістасць для браджэння, дзе знаходзіцца ад 20 да 90 хвілін, а потым раздзяляецца фармавальнай машынай на роўныя па вазе кавалкі. Машыніст загружае загатоўкі ў спецыяльную расстойную шафу, дзе яны «растуць», а потым перадаюцца ў печ.

— Без лішняй сціпласці скажу, што праца цеставода вельмі складаная, — прызнаецца дзяўчына. — Сачыць трэба літаральна за ўсім: дазіроўкай кампанентаў, тэмпературай, вільготнасцю цеста і многім іншым. Калі я дапушчу памылку — хлеб не атрымаецца такім, якім павінен быць. Уносіць карэкціроўкі даводзіцца не часта, але гэта здараецца. Напрыклад, магу заўважыць, што вільготнасць у цеста «няправільная» — у такім выпадку змяняю рэжым замесу. Насамрэч, якасць нашага прадукта залежыць ад вялікага мноства фактараў: ад сыравіны, дакладнасці тэхналагічнага працэсу і нават тэмпературы навакольнага асяроддзя. Яе зніжэнне ці павышэнне на некалькі градусаў можа кардынальна змяніць характарыстыкі цеста, што адаб'ецца на смаку. Задача цеставода — не дапусціць гэтага або кампенсаваць даступнымі сродкамі.

Усяго за васьмігадзінную змену праз цеставода праходзіць каля 15 вялікіх партый цеста. Дарэчы, вытворчасць тут не спыняецца ні ноччу, ні на выхадных. Брыгады працуюць чатыры дні ў адну змену, потым — два выхадныя, пасля змена мяняецца на наступную і гэтак далей. Нягледзячы на тое, што «рукамі» працаваць амаль не трэба, работа, па прызнанні Дар'і, стамляе ў першую чаргу фізічна — правесці на нагах восем гадзін запар зможа далёка не кожны. Працуюць тут пераважна маладыя дзяўчаты. Заробак — у межах сярэдняга па краіне. Акрамя таго, дзяўчыне далі пакой у заводскім інтэрнаце.

Размаўляем і пра кар'ерныя перспектывы спецыялістаў-цеставодаў. Напрыклад, Дар'я марыць прайсці павышэнне кваліфікацыі ў сваім каледжы, а пасля атрымаць вышэйшую адукацыю і стаць тэхнолагам. Калі планы спраўдзяцца, яна будзе адказваць ужо за ўсю вытворчасць на заводзе.

— Мне падабаецца наш калектыў, — кажа Дар'я. — Асабіста я люблю камунікаваць са старэйшымі супрацоўнікамі, лічу, што ад іх можна пачуць шмат карыснага, і не толькі ў плане працы. Работа дастаўляе задавальненне — цікава бачыць, як тое, што прайшло праз мае рукі, ператвараецца ў прыгожы і смачны хлеб. Дарэчы, сама заўсёды набываю «Нарачанскі» — прыемна ўсведамляць, што можаш лічыць «магазінны» прадукт зробленым уласнымі рукамі. Акрамя гэтага, работа не аднастайная, можна праявіць пэўную творчасць. Сумаваць на рабочым месцы проста няма калі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

*Свой выбар*

# ШТО ТРЭБА, КАБ СТАЦЬ АГРАНОМАМ?

**Хутка скончыцца навучальны год і ва ўсіх сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах краіны адбудзецца размеркаванне ўжо былых навучэнцаў і студэнтаў. Адным першае працоўнае месца спадабаецца, а іншыя паедуць туды амаль са слязьмі на вачах. Часцей за ўсё моладзь расчароўваецца, калі даводзіцца выпраўляцца на бліжэйшыя два гады ў вёску. Аляксандр ДРАНЕЦ не з такіх.**



Хлопец — малады спецыяліст. Ён працуе галоўным аграномам у ААТ «Кароцічы» Столінскага раёна. Аляксандр вучыўся ў Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце на агранамічным факультэце, які скончыў у 2015 годзе.

Пасля заканчэння школы з выбарам вышэйшай навучальнай установы ў Сашы праблем не ўзнікла. Хлопец сам з вёскі Рубель, таму адразу вырашыў пайсці вучыцца на агранома, бо любіў зямлю і ўсё, што з ёй звязана. Каб пасля ўніверсітэта вярнуцца ў родны край, Аляксандр узяў мэтавае накіраванне ў мясцовым СВК.

Але так здарылася, што праз пяць гадоў вакансіі не засталося і хлопцу прапанавалі адпрацоўваць па іншай спецыяльнасці. Саша адмовіўся і сам знайшоў сабе працу ў ААТ «Кароцічы».

Калектыў адразу добра паставіўся да маладога чалавека і прыняў яго. «Я люблю сваю работу, гэта насамрэч мая справа, — дзеліцца хлопец. — Каб быць аграномам, ім трэба нарадзіцца. Будзеш любіць зямлю, і яна будзе адказваць узаемнасцю».

Праца агранома вельмі адказная. Вясной пачынаецца падрыхтоўка палёў і пасяўныя работы. Аляксандр не толькі складае план, што і дзе лепей пасадзіць, як унесці ўгнаенні, але і сам рыхтуе тэхніку. Летам рабочы дзень ненармаваны. «Прачынаешся ў шэсць гадзін раніцы, а вяртаешся ўжо зацемна. Трэба кантраляваць уборку, апрацоўку культур». А зімой большасць часу Саша займаецца дакументамі. Неабходна напісаць усе справаздачы, скласці план на наступны год. Правярае, як захоўваецца насенне на складах. Работы хапае!

У вольны час Саша займаецца дробным рамонтам камп'ютараў. Таксама малады аграном захапляецца спортам: у добрае надвор'е ходзіць займацца на стадыён.

У горад хлопец не рвецца. Яму падабаецца праца на зямлі. Аляксандр марыць аб сваім доме, побач з якім будзе вялікі яблыневы сад. «А пакуль што ў маіх планах — працаваць і працаваць», — канстатуе малады спецыяліст.

**Марына ЛЯШКЕВІЧ,
студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже недвижимого имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» (Продавец) на праве хозяйственного ведения:

Лот №1– нежилое помещение с инв. № 330/D–182, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Интернациональная, д. 109.
Начальная цена с НДС – 19 320,00 бел.руб. Задаток – 966,00 бел. руб.

Лот №2 – здание нежилое с инв. №710/С–10624, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Чонгарская, д. 54.
Начальная цена с НДС – 80 304,00 бел. руб. Задаток – 4 015,20 бел. руб. Земельный участок площадью 0,0997 га с кадастровым номером 741000000006000013.

Лот №3 – гостиница с инв. №714/D–11556, расположенная по адресу: Могилевская обл., г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15.
Начальная цена с НДС – 49 266,00 бел. руб. Задаток – 2 463,30 бел. руб. Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516. Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200.

Лот №4 – комплекс из здания и строений, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4:
1. Здание склада (литер А 2/к) с инв. №500/С–8445.
2. Здание проходной (литер Б 1/к) с инв. №500/С–8494.
3. Здание специализированное автомобильного транспорта (литер Ж 1/к) с инв. №500/С–36553.
4. Гараж (литер В 1/м) с инв. №500/С–23647.
5. Гараж (литер Д 1/м) с инв. №500/С–23648.
6. Гараж (литер Г 1/м) с инв. №500/С–23649. На капитальные строения с инв. №500/С–8494; 500/С–36553; 500/С–23647; 500/С–23648; 500/С–23649 имеются свидетельства о регистрации.

Начальная цена с НДС – 919 968,00 бел. руб. Задаток – 45 998,40 бел. руб.
Аренда. Часть здания склада (литер А 2/к) с инв. №500/С–8445 сдается по договору аренды: – 152,5 кв. м до 22.07.2019; – 16,8 кв. м до 03.05.2020; – 34,3 кв. м до 14.10.2017. Гараж (литер В 1/м) с инв. №500/С–23647 сдается по договору аренды: 74,2 кв. м до 03.05.2020.
Земельный участок площадью 0,4575 га с кадастровым номером 500000000001000440. Право временного пользования. Срок действия по 31.05.2021.

Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС–Сбербанк», код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__), проводимом 03 февраля 2017 г. Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.
Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов согласно действующему законодательству.
Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение повторного открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Продавцу расходы на публикацию объявления на сайте bankrot.gov.by в сумме не более 120,00 (Сто двадцать белорусских рублей 00 копеек) в денежных знаках образца 2009 г.
На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь и настоящим договором для Победителя аукциона.
Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 №415–З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.
Аукцион состоится 03.02.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.02.2017 до 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2016. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона ino.by.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов аукциона: Сайко Андрей Геннадьевич 8 (044) 552-42-92.

**☎ Организатор аукциона:**
**8(017) 306–00–57, 8(029) 356–90–03, 8(029) 550–09–52**
**• www.ino.by • e–mail: torgi@ino.by**

### Отчет Местного благотворительного Фонда «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» об использовании своего имущества за 2016 год

Местный благотворительный Фонд «Возрождение Свято-Вознесенской церкви» информирует о продолжении своей деятельности согласно Уставу по адресу: Могилевская область, Мстиславский район, аг. Мазолово, ул. Центральная, д. 12.
1. Учредители фонда: Кириленко В. П., Иванкович Т. И., Стаховская И. О., Аврамчик Н. А., Сведомская Т. Ю., Шеладубова З. И., Лапуденко В. П., Чепикова А. В., Антюхова Н. П., Куксовский В. В.
2. Информация о стоимости имущества фонда:
- имущество, переданное учредителями фонда, – 1500,00 белорусского рубля;
- доходы, полученные от добровольных взносов и пожертвований граждан и организаций, – 40053,61 белорусского рубля;
- доходы от предпринимательской деятельности, осуществляемой в порядке, предусмотренном действующим законодательством, – нет;
- по состоянию на 01.01.2017 года остаток денежных средств на счете – 8215,28 белорусского рубля.
3. Информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в уставе:
- расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 31838,28 белорусского рубля.
4. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

УНП 790613142

УНП 805001004

### Справаздача Міжнароднага дабрачыннага фонду «Праект дапамогі дзецям Чарнобыля» аб выкарыстанні сваёй маёмасці за 2016 год

1. Колькасць заснавальнікаў Фонду – 8.
2. Набытай маёмасці не было.
3. Грашовыя сродкі, якія паступілі ад заснавальнікаў у якасці замежнай дабрачыннай дапамогі, – 180 163 еўра.
4. Гуманітарны груз, які паступіў ад заснавальнікаў у якасці замежнай дабрачыннай дапамогі, – 22 719,88 еўра.
5. Грашовыя сродкі ад грамадзян Рэспублікі Беларусь не паступалі.
6. Агульная сума расходаў, панесенных Фондам на дасягненне грамадска-карысных мэтаў, якія адпавядаюць статуту, – 363 882,20 беларускага рубля.
7. Прадпрымальніцкая дзейнасць Фондам не ажыццяўлялася.

РУП «Белпочта» объявляет о проведении переговоров по выбору подрядной организации для выполнения ремонтно-строительных работ на объекте «Текущий ремонт отделения почтовой связи № 64 по ул. Ландера, 36а в г. Минске».
Процедура переговоров состоится «23» января 2017 года в 09.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10. Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства РУП «Белпочта» – тел. 293-55-29.

УНП 101015738

## РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»

**извещает о проведении 30 января 2017 г. в 10-30 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 80% после третьих несостоявшихся торгов по продаже объекта недвижимости – здания склада запасных частей, расположенного по адресу: Гомельская обл., Брагинский р-н, г.п. Комарин, ул. Ленина В. И., 20В, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Брагинагросервис» на праве собственности**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) | Задаток, руб. (в т.ч. НДС по ставке 20%) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание склада запасных частей, **инв. №343/С-67904** | Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Одноэтажное кирпичное строение, 1962 года постройки. Общая площадь 404,8 м кв. *Составные части и принадлежности: пристройка* | **7 248,00** | **700,00** |
| ***Земельный участок** для обслуживания здания на праве постоянного пользования площадью **0,0604 га** с кадастровым номером 320355700001000320. **Имеются ограничения (обременения) прав на земельные участки: расположенные в водоохранных зонах рек и водоемов, площадь 0,0604 га; расположенные на территориях, подвергшихся радиоактивному загрязнению, площадь 0,0604 га.** Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |

Шаг аукциона – 15%. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9-00 до 12-00 и с 13-00 до 16-00 **по 27 января 2017 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.
В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09-00 до 10-30 **30 января 2017 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.
Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.
Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5%.
**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.
Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» 19 января 2017 г.
Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 4% от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за Объект, такая оплата должна быть произведена в течение 20 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.
Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» 30.09.2016 г. №189, от 16.11.2016 г. №221, от 10.12.2016 г. №239.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Брагинагросервис», Гомельская обл., г.п. Брагин, ул. Механизаторов, 4. ☎ 8 (02344) 2-15-47, 3-04-17, 8 (029) 179-62-71**

## Острошицкий сельский исполнительный комитет

**(организатор аукциона) извещает о проведении 20 февраля 2017 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | д.Чуденичи, ул. Строительная, 21 кадастровый номер 623286308101000461 | 0,1201 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 3 900,00 | 390,00 | 1485,23 |
| 2. | д.Чуденичи, ул. Молодежная 2-я, 16 кадастровый номер 623286308101000457 | 0,1196 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 3 900,00 | 390,00 | 1485,23 |
| 3. | д.Чуденичи, ул. Дружная, 6 кадастровый номер 623286308101000458 | 0,1199 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 3 900,00 | 390,00 | 1485,23 |

**Дата, время и место проведения аукциона**: 20 февраля 2017 г. в 10.00 по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.
**Прием документов:** ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 14.02.2017 включительно; к заявлению прилагается квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.
**Задаток** перечисляется на расчетный счет 3600619141105 в ОАО АСБ «Беларусбанк», код банка 153001795, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель – Острошицкий сельский исполнительный комитет.
**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.
**Конт. тел.: (8 017 74) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+375 29) 644 48 86.**

## Извещение о проведении 31 января 2017 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **№** | **Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов** | **Местонахождение предмета торгов** | **Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| 1. | Помещение физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения с инвентарным номером 500/D-7025745, общая площадь 624,8 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 25 | 373 467,07 | 37 000,00 |
| 2. | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150242, общая площадь 2008,7 кв. м; теплосети (инв. №01-178); электросети (инв. №01-169); сети водопровода (инв. №01-170) | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 159 748,32 | 100 000,00 |
| 3. | Административное помещение с инвентарным номером 500/D-708150241, общая площадь 11,7 кв. м | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 26 | 23 582,33 | 2 300,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск.
**Организатор торгов:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул.К.Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет коммунального унитарного предприятия «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся 31 января 2017 года в 12.00 по адресу: г.Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.01.2017 по 27.01.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости»);
(017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).

Для душы і цела

# МЫЛЬНЫ ЗАНЯТАК,

## або Як зварыць... торт

**Сяброўка запрасіла на дзень нараджэння. Цудоўна! Падарунак? Кубак з фотаздымкам? Калаж і рамку? Фен, туш, памаду? Загугліўшы «незвычайны падарунак», натыкаюся на кветкі, сэрцайкі, пірожныя і тарты... з мыла. А што, можа, заняцца мылаварэннем і зрабіць прэзент сваімі рукамі? Аказваецца, не ўсё так проста, як мне падалося, таму звяртаюся па майстар-клас да Ганны ДУНДУКОВАЙ, мылавара з Бабруйска.**

— Зрабіць мыла можа кожны! — узрадавала яна мяне. — Іншае пытанне, які выгляд яно будзе мець. Успамінаю свае першыя вопыты. Неяк убачыла фабрычнае мыла-скраб з кавай. Хм, можна ж самой паспрабаваць. Набыла дзіцячае мыла, надзерла яго на тарцы, расплавіла на вадзяной лазні, дадала кавы і заліла ў пластмасавы кантэйнер. Скажу шчыра, атрымалася нешта незразумелае, водар быў жудасны. Але гэта мяне не спыніла. Перачытала шмат літаратуры і паступова «набіла руку»: колькі чаго дабавіць, як фарбаваць, якія алеі для якога тыпу скуры падыходзяць, іх уласцівасці...

Дарэчы, неяк «мылаварыла» з дзеткамі 6—7 гадоў, і яны выдатна спраўляліся! Сапраўды, расплавіць аснову, дадаць усе патрэбныя «інгрэдыенты» і заліць у форму — нескладана. Куды больш цяжка кожны раз прыдумляць нешта эксклюзіўнае, сваё, тое, чаго няма ў іншых мылавараў. Гэта ж цікавей, чым капіраваць чужую ідэю. А натхняе мяне абсалютна ўсё — сям'я, сябры, прырода, музыка, ежа. Літаральна на днях зрабіла мужу, які працуе вадалазам-выратавальнікам, мыла — мора з вадалазамі.

— Як жа ўсё-такі зрабіць яго? — пытаюся я з нецярплівасцю.

— Існуе ўсяго тры віды дамашняга мылаварэння. Напэўна, самы просты, з якога ўсе пачынаюць, — пераплаўленне дзіцячага мыла. Здаецца, нічога складанага, набыў патрэбны матэрыял, расплавіў і дадаў, напрыклад, какосавы алей. Але ж не так проста пераплаўленае «скруціць» у патрэбную форму, ды і гатовы выраб мае не вельмі прыемны пах. «З нуля» альбо «жывое» мыла раблю пакуль рэдка, бо дома маленькі сын, а трэба працаваць са шчолаччу. У крыху падагрэтую сумесь алеяў дабаўляю моцны шчолачны раствор і змешваю блэндарам. Далей атрыманую «сырую» мыльную масу апрацоўваю — фарбую, араматызую, заліваю ў розныя формы...





Адразу і не скажаш, што гэта мыла.

Безумоўна, мыла «з нуля» — самае карыснае, але і самае цяжкае і небяспечнае ў прыгатаванні.

А вось сувенірнае альбо «звычайнае», якое «гатую» з мыльнай асновы, — маё хобі. Самай простай формы яно робіцца даволі лёгка: расплавіць аснову («пустое» мыла без колеру, паху, формы), дабавіць, напрыклад, базавы алей (абляпіхавы, какосавы ці іншы), фарбавальнікі, эфірны алей... і заліць у форму. Усё! Праз суткі гатова!

Часцей за ўсё раблю сувенірнае, а тэматыка залежыць ад свята: мандарыны, шампанскае, сняжынкі, кветкі, танкі, гранаты. Цікавае «наразное» мыла, напрыклад лавандавае ці мядовае, малюнак якога невядомы, пакуль не разрэжаш. Самае звычайнае аднакаляровае раблю прыкладна 15 хвілін, у выглядзе шматслаёвага пірожнага з ягадкамі — каля гадзіны, наразное — гадзіну-дзве ў залежнасці ад колькасці слаёў, абранай тэхнікі, складанасці. А вось у выглядзе торта — восем-дзевяць гадзін, гэта даволі працаёмкі працэс, але вынік таго варты! — дзеліцца мылавар.

Аказваецца, мылаварэнне даволі дарагое захапленне. Напрыклад, адна добрая сіліконавая крэатыўная форма каштуе каля 30 рублёў. Ёсць, канешне, і значна таннейшыя — пластыкавыя, але і мыла ў іх атрымліваецца менш цікавае.

— Пасля кожнай набытай формы я абяцаю сабе, што гэта апошні раз, а праз месяц зноў любуюся новай формай, — смяецца Ганна. — Вось і зараз набыла некалькі: планую «выстаўляцца» на кірмашы рамеснікаў, а муж з сынам усяляк дапамагаюць мне.

Сапраўды, «складаны» падарунак! Але ж паспрабаваць трэба, таму пайду набываць «аснову», алеі і фарбавальнікі. Можа, штонебудзь ды і атрымаецца.

**Юлія БУКЕЛЬ.**

Сугучча сэрцаў

# І ЛЯЦЯЦЬ ГАЛАСЫ, ДАНОСЯЦЬ ГІСТОРЫІ...

**Я вельмі добра памятаю дзень, калі з хору малодшых класаў перайшла ва ўзорны хор «Журавачка». Для нас, малых, ён заўсёды быў марай. Мы заслухоўваліся дзівоснымі галасамі яго ўдзельнікаў, якія дарылі да нас сваімі спевамі цэлыя гісторыі...**

Узорны хор «Журавачка» больш за дваццаць гадоў прапісаны ў Маладзечанскай дзіцячай школе мастацтваў. Калектыў з'яўляецца стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, неаднаразовым лаўрэатам абласных, рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. Адораных дзяцей пад сваім крылом збірае Вольга Паўлаўна Бялько, якая спаўна аддае сябе творчасці. «Дзяўчынкі, мы зможам усё!» — вось яны, словы вопытнага кіраўніка, якія распальваюць агонь у дзіцячых сэрцах.



— Усе чатыры гады ў калектыве я жыву ад рэпетыцыі да рэпетыцыі. На іх заўсёды пануе цудоўная атмасфера! Я вельмі ўдзячная хору і нашаму кіраўніку за незабыўныя гады ў маім жыцці, — падзялілася ўражаннямі вучаніца 9 класа гімназіі №6 Яна Пракаповіч.

«Журавачка» з'яўляецца пастаянным госцем міжнародных фестываляў. У жніўні 2016 года калектыў прыняў удзел у «11. international youth choir meeting Usedom» у Германіі. Незабыўныя эмоцыі і багаж новага вопыту прывезлі з сабой у Беларусь і дзеці, і педагогі.

— Работа з выдатнымі дырыжорамі з Іспаніі, Швецыі і Амерыкі, знаёмства з хорамі з Італіі, Эстоніі і Германіі, адпачынак на беразе мора і, вядома ж, музыка... — вось як апісваюць паездку ў Германію самі «журавачкі».

Рэпертуар у калектыва багаты, пачынаючы з духоўнай музыкі і заканчваючы беларускай народнай «Касіў Ясь канюшыну». Спяваем песні на англійскай, французскай, іспанскай і нават афрыканскіх мовах! Хор не баіцца эксперыментаваць і заўсёды дамагаецца пастаўленых мэт. Голас — гэта найскладанейшы інструмент, які патрабуе вялікай працы, і толькі рэгулярныя рэпетыцыі і жаданне быць лепшымі даюць вынік.

Сярод харыстаў вельмі цёплыя сяброўскія адносіны. Мы праводзім час разам не толькі на рэпетыцыях і канцэртах, але і ў паўсядзённым жыцці. Імяннінікаў заўсёды віншуем песняй і цукеркамі, кажам цёплыя словы і жадаем поспехаў. Кожны год у хор прыходзяць малодшыя дзяўчынкі, якія толькі робяць свае першыя крокі ў музыцы, і мы заўсёды імкнёмся дапамагчы ім. «Журавачка» — не проста хор, гэта адна вялікая сям'я!

Выпускнікі доўга не могуць развітацца з хорам і нават пасля заканчэння музычнай школы працягваюць наведваць заняткі. Некаторыя пазней паступаюць у музычны каледж імя М.К. Агінскага, Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, становяцца выдатнымі музыкантамі і педагогамі. Але ніхто і ніколі не забудзе «Журавачку».

**Паліна БАРАНОЎСКАЯ, вучаніца 10 класа СШ №8 г. Маладзечна.**

Друкуецца ў «Маладосці»

**Юльяна ПЯТРЭНКА**

# Няпрошаныя госці

*(Урывак)*

**«А ну-ка, хуценька адарвіцеся ад сваіх клопатаў, рондаляў і мігрэняў, распраўце плечы і ўключыце бляск у вачах! Запрашаю вас у мой чароўны свет, дзе ажываюць дрэвы і размаўляюць птушкі», — так запрашае да чытання свайго чарадзейнага твора аўтарка, якая не перастае верыць у цуды.**

**Значыцца, маладая пара на аўтамабілі вяртаецца здалёк з пакупкамі для будучага вяселля. Машына ў дарозе ламаецца. Да дома яшчэ далёка, а ноч ужо блізка. Да таго ж завіруха...**



РАПТАМ з завірухі выплыла і паўстала перад вачыма невялікая крывенькая хацінка. Маленькае акенца кідала бледнае святло на маўклівы снег, патанала ў ім. Шызы дым, што выходзіў са старога коміна, не паспяваў узняцца ўгору, у чорнае неба, як адзічэлы вецер прыціскаў яго долу і бязлітасна матляў ва ўсе бакі. Пахла хвояй і смалой.

Старэнькі тын пакасіўся пад цяжарам снежных шапак. Купка высокіх раскідзістых дрэў навісала над хатай, змыкаючы чорнае вузлаватае галлё, і хвастала ім пад ударамі ветру па даху. За самай хатай злавесна ўзнімаліся змрочныя грабяні густога лесу.

Алесь спыніўся і насцярожана зірнуў на Аксану. Дзяўчына стаяла ў нерашучасці і трывожна ўглядалася ў маленькае акенца, вакол якога няспынна мітусіліся белыя снежныя мятлікі. Калі звярынае выццё пачулася зусім побач, Аксана мацней сціснула сваю торбачку і заспяшалася наперад. Яна з цяжкасцю прабралася праз рэдкі тын да старой хацінкі і нясмела загрукала ў размаляваную марозам шыбу. Пачакала з хвіліну і затарабаніла зноў. За акном мільгануў зыбкі цень, і праз колькі хвілін рыпнулі дзверы.

— Хто там? — пачуўся з цемры асіплы старэчы голас.

— Добры вечар! — Аксана ўзнялася на дыбачкі і выцягнула шыю, каб лепш разглядзець гаспадара. — У нас машына зламалася!

— Дзе можна трактар узяць, не скажаце? — смела ступіў наперад Алесь. — Я заплачу́.

— Не ведаю, — пачулася ў адказ. — Там, за лесам, вёска.

На гэтым размова скончылася, дзверы грукнулі. Аксана не паспела адкрыць рот, каб упікнуць Алеся ў нерашучасці, як па храбусткім снезе заспяшаліся да веснічак мяккія таропкія крокі.

Неўзабаве над плотам паказалася сівая галава і кручканосы маршчыністы твар з доўгай ускудлачанай барадой, якая развявалася на ветры.

— Што трэба? — стары вышэй узняў каўнер кажуха, хаваючыся ад колкага снегу.

— Машына, кажу, заглохла, — паўтарыў хлопец. — Акумулятар, відаць, здох... «Падкурыць» бы.

Стары маўчаў у роздуме. Алесь маўчаў таксама, чакаючы адказу і якой-небудзь прапановы.

Нарэшце загаварыла Аксана:

— Змерзла я зусім, і печка не працуе, халера яе бяры!

Стары зразумеў гэта правільна: адразу заляпаў старымі веснічкамі, каб упусціць няпрошаных гасцей. Затым згорбіўся яшчэ больш, захутаўся ў стары кажух і пакрочыў у хату. Следам заспяшалася Аксана. Алесь сяк-так зачыніў веснічкі і пабег за ёю.

— Сюды, — вуглаватая постаць знікла за нізкімі дзвярыма, і госці нырнулі следам.

Хата дыхнула ў твар цяплом, гаркаватым пахам сасновай смалы і нейкіх зёлак. Стары скінуў у сенцах кажух і ў вялізных валёнках пакрочыў далей. Госці кінулі вопратку на стары куфар, пакінулі мокры абутак на плецяным палавічку і пашлёпалі па цёплай драўлянай падлозе ўслед. Мінулі нізкую крэпкую драўляную лесвіцу наверх і, адкінуўшы зношаную занавеску, увайшлі ў цесную куханьку, палову якой займала даўно нябеленая печ. Над ёй звісалі пучкі сушаных зёлак і нанізаныя на нітку вялізныя шапкі грыбоў. На падлозе ляжалі абы-як зваленыя дровы.

Стары ўладкаваўся на абшарпаным зэдліку каля самага стала, на якім самотна прымасцілася газавая лямпа. Яе цьмянае святло дрыжэла і калыхалася на аконнай шыбе.

Алесь незадаволена разглядаў гаспадара. Залапленыя нагавіцы запраўлены ў валёнкі, брудная камізэлька, з-пад якой выглядала шэрая ільняная кашуля, зашпіленая на адзін гузік. Стары ссунуў густыя сівыя бровы і засяроджана стругаў нешта з палена ножычкам. Мяккая жоўтая стружка снегападам сыпалася на падлогу.

Аксана апусцілася на другі зэдлік і падціснула азяблыя ногі ў тонкіх калготках. Абвяла позіркам пакой. З цёмнага вугла выглядаў завалены хламам і старой вопраткай тапчан. Над ім — пасечаны моллю дыван з казулямі і паляўнічымі.

— Вёска за лесам, — хрыпла паўтарыў стары, не адрываючыся ад сваёй справы.

— Гэта мы ўжо зразумелі, — пагадзіўся Алесь, разглядаючы небагатую абстаноўку.

— А мы з рынку едзем, накуплялі ўсяго для вяселля. Адно мытню пераехалі, а тут завея, — весела шчабятала Аксана. — І ваўкі. Чулі, як выюць?

Яна сцепанулася.

Стары адклаў у бок ножычак і прымружыў глыбокія чорныя вочы:

— Спаць наверсе будзеце, — узняў ён тонкі вузлаваты палец, бледны, як печ. Затым падняўся, адкрыў брудную засланку і падкінуў у чорную пашчу печы некалькі палянцаў. Весела затрашчаў у ёй чырвоны агеньчык, які з задавальненнем заглытваў бярозавыя дровы. — Спаць трэба, — пазяхнуў стары. — А заўтра двор мне пачысціце.

— Дык не пытанне, — адказаў Алесь і прыціснуў да сябе разгубленую негасцінным прыёмам Аксану. — Але невядома, ці завея сціхне.

— Сціхне, — расшпіліў стары адзіны гузік патрапанай камізэлькі. — Ваўчок на надвор'е вые.

— А-а-а, зразумела... — нацягнута ўсміхнулася Аксана. Павярнулася да Алеся і закаціла вочы, каб паказаць, што стары ўжо зусім не цяміць. Ледзь утрымалася, каб не пакруціць пальцам каля скроні.

— Кавы? — спытаў стары, пільна ўглядаючыся ў расчырванелы ад цяпла твар дзяўчыны.

— Не. А мы гэта... перашкаджаць вам не будзем? — пацікавілася яна.

— Вы мне — не. Толькі сядзіце там наверсе ціхенька... Ох, і дрэнная ноч...

SEX-БАЛЯСЫ

# КАБ БЫЛО ЦЁПЛЕНЬКА!

**Памятаеце, як мы жартавалі, калі першае снегавое покрыва імгненна знікла і перспектывы яго аднаўлення да зімовых свят былі цьмяныя? «Я выпаду зараз, але гэта вам як быццам бы на Новы год. Снег». А зусім нядаўна градус гумару істотна змяніўся. «Самае здзеклівае, калі пры мінус 37 градусах далей пішуць «сонечна». Так што прыціснула, дык прыціснула. Маю на ўвазе не столькі ўласна маразы, як тое, наколькі яны адбіліся на нашых паводзінах. («— За апошнія дні выпала 5—6 сантыметраў снегу. Ці, як гавораць хлопцы, 16—20 сантыметраў. — Гэта далёка не адзіны выпадак выпадзення снегу. Ці, як кажуць дзяўчаты, «канешне, ён першы».) Іншымі словамі, часам у галаву б'е не толькі спёка, але і сцюжа.**

Ну, вось хоць бы апошні прыклад, калі ў сеціве з'явіўся ролік, дзе мінчанін на марозе б'ецца з... дыванам. Яго за тры дні прагледзела больш за мільён чалавек. Дык вядома, тое яшчэ відовішча! Тым больш што дывану ў схватцы ўдавалася нават адпор «крыўдзіцелю» даваць. Злыя языкі кажуць, што такім незвычайным чынам мужчына спаганяў злосць на жонку, якая ў мінусавое надвор'е выгнала яго з дому выбіваць той самы дыван. Ну, вось ён і разышоўся... («Калі мужчына нясе на плячы выбіваць скручаны дыван, ён проста абавязаны стрэліць з яго па гаражах, як з базукі».)

А яшчэ прыгадваю выпадак, як адзін хлопец паспрачаўся, што дойдзе да суседняй вёскі ў... сланцах. Гэта ў мароз, і бліжэй да вечара! Небараку, на шчасце, паспелі выратаваць, але ўсё магло скончыцца вельмі трагічна. У гэтай сувязі прыгадваецца выступленне аднаго стэндапера па тэлебачанні. «У 20 гадоў ураджанне, што ўзяў арганізм напракат. Проста глядзіш: выжыве ён ці не?» Пра сябе выступоўца кажа: «У 35 гадоў ты апранаешся, як у шэсць гадоў: пухавік, шапка і калготкі... А мне цёпленька, зразумела?!» А што, нават у такім прыкідзе можна прыцягваць увагу процілеглага полу. Не верыце? «На вуліцы галалёдзіца. Мара пра тое, што ўсе дзяўчаты будуць каля маіх ног, пачынае збывацца. Пакуль сходзіў у краму, дзвюм дапамог устаць, а з адной... нават паляжаў». І не кажыце, што з вамі такога ніколі не здаралася. «Мінус 35 — гэта такое надвор'е, калі якую песню табе плэер уключыў, такую ты і слухаеш».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мужчыны, канешне, часам бываюць дзівакамі, але пальма першынства, несумненна, застаецца за жанчынамі. У любую пару года. («Дзень быў дзіўным. Прырода строіла з сябе зіму, аўторак «касіў» пад пятніцу».) Вось самы просты прыклад. Стаяць каля Дома прэсы мужыкі, размаўляюць. Міма праходзіць уся з сябе такая «фіфа». Футэрка, доўгія распушчаныя валасы, такія ж доўгія ногі, зацягнутыя ў ультрамодныя вузкія штаны (ну, памятаеце адзін з кліпаў «Ленінграда»?), абедзве рукі глыбока ў кішэнях. (Як у «Службовым рамане»: «Паходка свабодная ад сцягна. Разняволеная свабодная пластыка пантэры перад скачком. Мужчыны такую жанчыну не прапускаюць!») І, галоўнае, крочыць яна... Не, не на лабутэнах. Ёсць такія жаночыя боцікі на высокім абцасе кшталту «капыток». (З вышэйзгаданага фільма: «Менавіта абутак робіць жанчыну жанчынай».) Не вельмі ўстойлівы, скажам так, абутак. Дык вось, усе мужчыны моўчкі самі сабе ацанілі даўжыню і стройнасць ног прахожай («Колькі дзяўчыну не кармі, яна ўсё роўна ў ласіны ўлезе»), але ўслых толькі адзін з прысутных выказаў адну агульную думку: «Шкада, спатыкнецца — паб'ецца...» Прычым тут гэта? Паўтараю спецыяльна для дзяўчат: абедзве рукі прыгажуні былі глыбока засунутыя ў кішэні тых самых «вельмі модных» штаноў. Простая логіка любога мужчыны падказвае: калі дзяўчына паслізнецца — паб'ецца, бо не зможа балансаваць рукамі. («Дакладна старэю: без шапкі холадна, на абцасах — нязручна!»)

Спадзяюся, усё з той прахожай абышлося, яна хоць у шубцы была, прынамсі, не мерзла. («Софа ніколі б не даравала Яшу яго чарговую здраду, але ўсё сапсавала новае норкавае футра».) А вы бачылі юных стварэнняў у самую халадэчу, апрануты так, што толькі ад позірку на іх самому робіцца ніякавата? Памятаеце мініяцюру «Уральскіх пельменяў» «Дзяўчына і рыбак на прыпынку»? Так і хочацца падысці да гэтай дзяўчыны і спытаць словамі з яе: «Ці цёпла табе, дзеўчына, ці цёпла табе... синяя»?... Жонка расказвала, што неяк у юнацтве адзін хлопец з іх кампаніі вырашыў праверыць, як адчуваюць сябе дзяўчаты на марозе ў танюткіх калготках. Увечары, калі сцямнела (каб ніхто не бачыў), нацягнуў іх на сябе і збегаў у двор. Калі вярнуўся праз некалькі хвілін, вочы ў яго былі, як тыя сподачкі... («Толькі нараджаючы дзіця, жанчына набліжаецца да таго болю, які адчувае мужчына з тэмпературай 37,2».) Карацей, нягледзячы на маразы, у некаторых прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва — непакрытыя галовы, голыя ногі. (З той жа мініяцюры. «Можа табе шапку даць? — Я прычоску сапсую! — А мазгі не сапсуеш? — Каму я на дыскатэцы буду патрэбная з мазгамі і без прычоскі?»)

Так, напэўна, у маладосці бывае з кожным, калі грэе «прыродная батарэйка». Ну, і не толькі яна, яшчэ «падаграе» імкненне некаму спадабацца хоць бы і такім чынам. («Малады чалавек, купіце кветкі сваёй дзяўчыне, а то я ўжо замерзла тут стаяць... — А пачым кветачкі? — Дзесяць рублёў штучка. — Вам трэба цяплей апранацца».) Таму зычу ўсім цяпла, у тым ліку, найперш, душэўнага. Зрэшты, дзяўчаты, апранацца ўсё ж такі трэба. У гэтым таксама можа быць інтрыга. («Дзяўчына, які ў вас прыгожы світар! — Гэта сапраўдная вярблюджая шэрсць. — Так, я адразу пазнаў па двух горбіках».)

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Гонкі адмяняюць толькі ў шторм»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**



— Я не спадзяваўся, што заваюю ліцэнзію на Алімпійскія гульні, а быў у гэтым упэўнены, — расказвае Мікіта. — Гэта найважнейшыя спаборніцтвы ў жыцці кожнага спартсмена, удзел у іх — вялікі вопыт і шчаслівы шанц, які выпадае далёка не кожнаму. Своеасаблівы вынік працы, якую ты прарабіў за чатыры гады.

***— Раскажы, чым запомнілася алімпійская Бразілія?***

— Прайшло ўжо паўгода, а такое адчуванне, што адны суткі. Усе 20 дзён, якія мы былі там, — адно вялікае «ваў». Хоць, вядома, былі і негатыўныя моманты. Яны шмат у чым звязаныя з арганізацыяй спаборніцтваў: пражываннем, дастаўкай на трэніроўкі і самой акваторыяй. Вада была брудная, хоць казалі, што арганізатары вельмі пастараліся, каб хоць неяк яе ачысціць. Перада мной не ставілі канкрэтных задач, трэба было проста паказаць тое, на што я здольны. Зразумела, што гэтая Алімпіяда яшчэ не «мая», таму пра медалі размова не ішла, галоўнае — атрымаць вопыт, які ў Токіа-2020 дапаможа пазмагацца за больш высокія месцы.

***— Тое, што ты трапіў на Гульні ў такім маладым узросце, можа расхаладзіць?***

— Наадварот, гэта прымушае працаваць яшчэ больш, цяпер я павінен пацвярджаць свой вынік, трымаць зададзеную планку. Уся падрыхтоўка, удзел у рэгатах распісаны на чатырохгадовы цыкл і скіроўваюць менавіта да гэтай вяршыні. Чэмпіянаты і Кубкі свету тут адыходзяць на другі план.

**«Дэльфіны — гэта нашы сябры. Часам назіраем, як яны мігруюць цэлымі групамі».**

***— Шмат у вашым відзе спорту залежыць ад надвор'я?***

— Няма ветру — няма трэніроўкі. Але калі дзьме пастаянна, то таксама дрэнна, нам трэба нешта сярэдняе. Для прадуктыўных заняткаў павінен быць умераны клімат, тэмпература не вышэйшая за 25—27 градусаў, каб не было спякоты, інакш занадта вялікая нагрузка на арганізм. Калі казаць пра халодныя ўмовы надвор'я, то трэніруемся мы ў гідракасцюмах да таго часу, пакуль не будуць нямець канечнасці. Рукі і ногі ў нас заўсёды голыя. Камфортна, калі ўмераная хваля, а дождж для нас зусім не перашкода: тая ж вада, толькі зверху. Гонкі адмяняюць толькі ў шторм.

***— Падрыхтоўку матчасткі — паруса і дошкі — праводзяць самі спартсмены?***

— Матчастка — гэта 50 працэнтаў поспеху, на бервяне ты не паедзеш, таму догляд, падрыхтоўка дошкі пад сябе, — гэта велізарная частка падрыхтоўкі да спаборніцтваў, якой мы займаемся самі. Ідэальная матчастка можа падняць вынік спартсмена на 10—15 пазіцый.

А наогул яшчэ шмат момантаў, ад якіх залежыць поспех. Напрыклад, стратэгія. У залежнасці ад умоў надвор'я, ад заліва, у якім праходзіць рэгата, трэба правільна размеркаваць свае сілы па дыстанцыі, прадумаць тактыку праходжання гонкі. Перад спаборніцтвамі мы заўсёды знаёмімся з акваторыяй, дзе будзем выступаць. Важна вывучыць усе ўмовы, каб прыкладна ведаць, адкуль можа прыйсці вецер і куды ён пойдзе. Вядома, прысутнічае ў нашым відзе спорту і элемент удачы.

***— Ці даводзілася сустракацца з кімсьці з марскіх жыхароў?***

— Арганізатары не праводзяць спаборніцтвы ў акваторыі, дзе могуць быць акулы або касаткі, напрыклад. Самае небяспечнае, з чым я калі-небудзь сутыкаўся, — гэта водныя змеі, але калі ты не падаеш у ваду, то на дошку яны не залазяць. А так, дэльфіны — гэта нашы сябры. Часам назіраем, як яны мігруюць цэлымі групамі. Але дэльфіны не перашкаджаюць нам, абмінаюць. Самае цікавае, што бачыў, было ў знакамітай акваторыі Сан-Францыска. На дыстанцыі сустрэліся марскія коцікі. Яны вельмі смешна ляжаць на вадзе, дрэйфуюць, толькі калі падыходзіш бліжэй, яны ныраюць і знікаюць у вадзе.

***— Калі вярнуцца да пачатку тваіх заняткаў парусным спортам, што цябе ў ім зацікавіла?***

— У дзяцінстве займаўся многімі іншымі відамі спорту, але нідзе надоўга не затрымліваўся. Самым працяглым захапленнем, як ні дзіўна, былі шахматы. А ў парусны спорт прыйшоў зімой, таму некалькі месяцаў займаўся ў басейне і зале. Толькі ў маі выйшаў на ваду. Першы раз, напэўна, не забуду ніколі ў жыцці. Было складана, жудасна страшна. Калі дзьме моцны вецер, ты яшчэ малы, не спраўляешся, цябе зносіць далёка ад базы... Гэта такая методыка выкладання: ты павінен сам навучыцца вяртацца на бераг. Але, нягледзячы на страх, я захапіўся...

**«Трэніруемся мы ў гідракасцюмах да таго часу, пакуль не будуць нямець канечнасці».**

***— Ведаю, акрамя спорту цябе цікавіць кіно. А кнігі чытаеш?***

— Апошнім часам менш, але быў момант, калі чытаў шмат. Калі гаварыць пра кінематограф і літаратуру, я не паддаюся модным павевам, не люблю масавасць. Перш за ўсё цаню ў кіно і кнігах гісторыю. Лічу, што добрая кніга тая, якая прымусіла цябе задумацца, нават калі гэта дзіцячая казка.

***— Што звычайна гучыць у тваіх навушніках?***

— Я залежны ад музыкі, напрыклад, не магу ехаць у метро пад грукат колаў. Калі знаходжу нейкі трэк у пэўным стылі, пачынаю больш падрабязна яго вывучаць, гляджу, шукаць іншых выканаўцаў. Але нейкіх канкрэтных пераваг няма.

***— Актыўны адпачынак падабаецца?***

— Так, люблю ўсё, што на колах: веласіпед, круізер (дошка на колах), сноўборд, вядома, у мяне таксама ёсць.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*lobazhevich@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008.

Нумар падпісаны ў 19.30 18.01.2017 г.

# ПАЧАТАК МІСІІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Можна сустрэць меркаванне, што знешнепалітычная служба тады фактычна не функцыянавала. Гэта не зусім так. Яна не функцыянавала ў нашых сённяшніх уяўленнях, але ў тых рэаліях яна працавала, пра што сведчыць не толькі структура камісарыята, назвы аддзелаў, пратаколы пасяджэнняў урада, ЦБ КП(б)Б, але і газетныя публікацыі. Так, газета «Звезда» 22 студзеня 1919 года паведамляла, што «камісарыят па знешніх справах адкрыў сваю дзейнасць». Гэта было першае публічнае паведамленне аб пачатку дзейнасці камісарыята. З той жа інфармацыі мы даведаліся, што камісарыят быў размешчаны па адрасе: Койданаўская вуліца, нумар 21.

Раней, у газеце «Звезда» ад 15 студзеня 1919 года, быў змешчаны спіс абанентаў, якія ўключаны ў Мінскую тэлефонную сетку, дзе абанент — старшыня камісарыята замежных спраў, тэлефонны нумар у яго рабочым кабінеце быў «69».

***— Што вядома пра іншых членаў камісарыята па замежных справах ССРБ?***

— На жаль, пра гэтых людзей мы ведаем мала. Іх імёны і праца — прадмет для далейшых даследаванняў. Хацелася б, каб гісторыкі зацікавіліся іх лёсам. Зараз, калі мы ведаем іх прозвішчы, узнікаюць пытанні: што гэта былі за людзі, як яны прыйшлі ў камісарыят, як склалася іх жыццё потым, калі камісарыят быў ліквідаваны?

Ведамасць за студзень 1919 года на атрыманне заробку супрацоўнікамі камісарыята сведчыць, што некаторым з іх ён выплачваўся з канца снежня 1918 года. Гэта значыць, што была група людзей, якая працавала над стварэннем камісарыята, магчыма, шукала памяшканне, вырашала іншыя пытанні, звязаныя з арганізацыяй яго работы.

Вядома, што сярод іх быў І. Чайкоўскі, які ўзначальваў эканоміка-прававы аддзел і часова з'яўляўся кіраўніком справаў. У камісарыяце таксама працавалі Г(?). Райградскі — адказны бухгалтар, С. Мазель — агент для асаблівых даручэнняў, машыністка Дзмітрыеўская, якая ведала замежныя мовы, адказны карэспандэнт замежнага аддзела А. Бал, журналіст М. Калантай...

***— Уласная прэс-служба?***

— Магчыма. Думаю далейшыя даследаванні дапамогуць знайсці нямала цікавых матэрыялаў, звязаных з дзейнасцю першага камісарыята па замежных справах. Ва ўсякім выпадку камісарыят існаваў не толькі на паперы, гэта бачна з даручэнняў, якія былі яму дадзеныя, і са справаздач, з якімі камісарыят выступаў на пасяджэннях урада.

***— Якія гэта былі даручэнні?***

— У прыватнасці, на пасяджэнні ўрада 27 студзеня 1919 года было заслухана пытанне «Аб рэакупацыі маёмасці і ўстаноў Беларусі», і камісарыяту даручалася хадайнічаць перад Цэнтрам — урадам РСФСР аб вяртанні Беларускай Рэспублікі ўсёй эвакуіраванай маёмасці.

Таксама быў заслуханы даклад члена ўрада па замежных справах Беларусі аб уліку замежнікаў прызыўнога ўзросту.

Пастановай Прэзідыума Часовага рабоча-сялянскага ўрада пры камісарыяце знешніх спраў быў заснаваны аддзел па зборы матэрыялаў пра «розныя бясчынствы, канфіскацыі і падобнае, учыненае нямецкімі акупацыйнымі войскамі». У газеце «Звезда» 30 студзеня 1919 года быў апублікаваны Дэкрэт Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі аб зборы матэрыялаў, якія датычацца беззаконняў нямецкіх акупацыйных войскаў. Эканоміка-прававому аддзелу пры камісарыяце замежных спраў Беларусі было даручана правесці збор і распрацоўку матэрыялаў і сведчанняў пра здзейсненыя нямецкімі акупацыйнымі войскамі падчас заняцця імі Беларусі распараджэнні і дзеянні, якія парушалі нормы пралетарскага права. Даручалася зрабіць падлік шкоды ад такіх распараджэнняў і дзеянняў для дзяржавы, устаноў, саюзаў і прыватных асоб. У кожным губернскім горадзе ўсталёўвалася па адным прадстаўніцтве эканоміка-прававога аддзела камісарыята для збору і апрацоўкі сабраных матэрыялаў. Даручалася ўсім камісарыятам, мясцовым Саветам і падведамасным установам прадстаўляць такія матэрыялы ў названы аддзел або пададдзелы камісарыята замежных спраў. Дарэчы, нам удалося высветліць, што адзін з такіх аддзелаў быў створаны ў Гродне, і яго загадчыкам быў І. Ненецкі.

***— Атрымліваецца, што з самага пачатку свайго існавання знешнепалітычнае ведамства нашай краіны абараняла правы і інтарэсы беларускай дзяржавы ў міжнародных адносінах.***



Цена № в Минске 50 коп. На станц. ж. д. 60 к.

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

ЗВЕЗДА

Орган Центрального Бюро
и Минск. Ком. Коммунистической партии (большев.) Белоруссии.

РЕДАКЦИЯ: Минск, Петропавловская ул. д. № 30.

Прием по делам редакции ежедневно, кроме праздн. дней с 1 до 2 час. дня.

Статьи, заметки и прочий материал, присылаемый в редакцию, должен быть написан или написан на одной стороне листа.

Рукописи не сохраняются; по поводу их редакция не вступает ни в какую переписку или переговоры.

Всякого рода резолюции и постановления должны снабжаться печатью и подписями.

Адрес ночной Редакции—1-я Советская Типография, плош. Свободы, Тел. 87.

Условия подписки с 1-го Января 1919 г.

В России 10 рублей за месяц, 2 месяца 20, 3 мес. 30 р. Заграницу 15 р. за мес.

Подписка принимается только с 1-го числа каждого месяца.

Адреса просим писать разборчиво и точно.

Газета высылается только по получении той суммы, на какое время она выписана.

Высылка газет в провинцию багажом по жел. дор. в количестве не менее 50 экз. производится по условиям оптовой продажи.

За всеми справками, касающимися условий подписки, высылки газеты и т. д. обращаться исключительно в Губагентство, Минск, ул. Подгорной и Губернаторской.

При всяких письменных сношениях с конторой просим прилагать ее адрес (под печатки ярлык) и для письменного ответа марки.

Перемена адреса 1 руб. 50 коп.

Контора открыта ежедневно, кроме праздничных, дней, от 10 ч. утра до 4 ч. дня.

№ 354. Среда 22 января 1919 г. № 354.

Товарищи рабочие, сегодня все на улицу и на собрания, чтобы почтить память погибших 9 января 1905 года и борцов за коммунизм Карла Либкнехта и Розы Люксембург, павших от рук наемников буржуазии!

**Нумар газеты «Звезда», у якім упершыню паведамлялася пра адрас і пачатак дзейнасці першага знешнепалітычнага ведамства нашай краіны.**

— Звярніце ўвагу, што размова ідзе не толькі пра арганізацыі і ўстановы, але і пра прыватных асоб!

Такім чынам, мы маем дакументальныя пацвярджэнні таму, што камісарыят быў, што ён дзейнічаў. Мы не ведаем дакладна, што ён паспеў зрабіць за гэты кароткі час, але ён несумненна працаваў.

Усе гэтыя знаходкі сталі магчымы дзякуючы падтрымцы даследаванняў Клуба ветэранаў з боку кіраўніцтва МЗС, а таксама дапамозе былога дырэктара Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Уладзіміра Адамушкі, галоўнага архівіста Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Надзеі Дзюбы і галоўнага архівіста Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Уладзіміра Дзянісава.

***— Ці можна сказаць, што архіўныя дакументы, у тым ліку паведамленні ў газеце «Звезда», дапамаглі ўдакладніць некаторыя падзеі і важныя даты ў гісторыі Міністэрства замежных спраў Беларусі?***

— Відавочна, так.

***— Які быў далейшы лёс камісарыята па замежных справах?***

— Гэта таксама пытанне, якое патрабуе дадатковых даследаванняў. Калі Першы Усебеларускі з'езд Саветаў прыняў рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай Рэспублікі, склад урада быў перагляджаны. Камісарыят па замежных справах ліквідавалі, былыя супрацоўнікі камісарыята — чатыры чалавекі — перайшлі ў замежны аддзел пры камісарыяце ўнутраных спраў. Персанальны лёс супрацоўнікаў першага камісарыята па замежных справах, за выключэннем Фальскага, на жаль, нам не вядомы.

Лёс Усевалада Фальскага, які з'яўляўся не толькі дыпламатам, але і вядомым акцёрам (дарэчы, іграў у «Паўлінцы» Купалы), склаўся даволі трагічна: арышты ў 1919-м, потым у 1921 годзе. Яго нават прыгаварылі да расстрэлу, але прыгавар быў заменены на пяць гадоў зняволення ў Смаленскай катаржнай турме.



36—эсеры.
22—„Поалей Цион".
7—меньшевики.
2—с. с. и е. с.
1—радикал Поалей-Цион.
9—безпартийные.
Из 30030 получивших избирательные записки, голосовало до 19000 по 61 избирательному собранию.

**В Комиссариате по внешним делам.** Комиссариат по внешним делам открыл свою деятельность. Комиссариат помещается по Койдановской ул. № 21, кв. 2.

**Городской продовольственный Комитет.** В Минском городском продовольственном комитете, преобразованном из отдела общественного питания Райпродкома, идет организационная работа.

Адтуль Фальскі быў датэрмінова вызвалены, але вярнуцца ў Беларусь не змог і з 1925 года жыў у Кіеве, узначальваў драматычны тэатр. На гэтым яго след губляецца. Калі не памыляюся, у 1996 годзе Усевалад Фальскі быў рэабілітаваны.

***— Як вам удалося знайсці будынак, у якім тады размясціўся камісарыят?***

— Койданаўская — гэта адна з цэнтральных вуліц старога Мінска, на ёй размяшчалася шмат устаноў, жылі заможныя мінчане, было некалькі прыватных клінік. У 1922 годзе вуліца ў сувязі з 5-годдзем Кастрычніцкай Рэвалюцыі была перайменавана ў Рэвалюцыйную. Больш яна не перайменоўвалася. Супрацоўнікі Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ўстанавілі, што дом №21 па вуліцы Койданаўскай — гэта гістарычны будынак, які захаваўся, і які цяпер мае нумар 15 па вуліцы Рэвалюцыйная.

***— Чаму так важныя ўсе гэтыя факты? У чым звышсэнс гэтых знаходак?***

— Размова ідзе пра гісторыю будаўніцтва нашай дзяржавы. Пра тое, як усё пачыналася. Што і як рабілася для таго, каб маладая Беларусь заняла «свой пачэсны пасад між народамі». Для мяне, як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, і як для былога супрацоўніка МЗС, было вельмі цікава, калі ж пачала працаваць менавіта дыпламатычная служба нашай краіны. Не толькі — калі ўсталяваныя першыя дыпламатычныя кантакты на беларускіх землях, не толькі — калі распачалася знешнепалітычная дзейнасць, а калі ўзнікла менавіта служба, якая займалася вырашэннем пытанняў знешняй палітыкі. Вельмі важна, што камісарыят не проста быў створаны, але ён працаваў, дзейнічаў. У студзені 1919-га пакладзены пачатак, які меў працяг. Не выпадкова ў студзені 1999 года, калі мы святкавалі 80-годдзе беларускай дыпламатыі, у віншаванні Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі работнікам дыпламатычнай службы, у прыватнасці, было адзначана, што на працягу гэтага перыяду дыпламаты нашай краіны «годна выконвалі сваю місію на міжнароднай арэне».

**При камісарыяце знешніх спраў быў заснаваны аддзел па зборы матэрыялаў пра «розныя бясчынствы, канфіскацыі і падобнае, учыненае нямецкімі акупацыйнымі войскамі».**

***— Што яшчэ вас уразіла, калі вы пагрузіліся ў архіўныя дакументы?***

— Я лепей адчула час, у які стваралася дыпламатычная служба нованароджанай дзяржавы, — вельмі складаны і надзвычай цікавы. Дакументы, што захаваліся ў архівах, сведчаць пра чалавечы твар новага ўрада. З самага пачатку сваёй работы беларускі ўрад вырашаў пытанні пра дзіцячыя садкі, пра бясплатную адукацыю, пра прадастаўленне жылля, пра беспрытульных дзяцей — як іх накарміць, апрануць... Усё гэта нараджае пачуццё гонару за справу, да якой маю дачыненне. За краіну, у якой нарадзілася і жыву, у якой жылі продкі. Беларусамі перажыта шмат. Але памкненні тых, хто ствараў нашу дзяржаўнасць, ад самага пачатку былі высакароднымі. Годныя нашага народа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*



**Выява фасада мураванага дома па вуліцы Койданаўскай на праекце па яго рамонце і перабудове 1879 года. Праз 40 гадоў тут размесціцца камісарыят па замежных справах Беларусі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Сучасны выгляд будынка, у якім у 1919 годзе працаваў камісарыят па замежных справах маладой Беларускай Рэспублікі.**

## ГІСТОРЫЯ БДУ — НА САЙЦЕ-ФОТААРХІВЕ

**Лічбавы фотаархіў створаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яго калекцыя ўключае больш як 20 тысяч фотаздымкаў і каля 700 калекцый, якія ахопліваюць амаль стагадовую гісторыю ўніверсітэта.**

Асновай для стварэння віртуальнай экспазіцыі стаў архіў фотаматэрыялаў розных перыядаў. Самыя раннія здымкі адносяцца да 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Фатаграфіі расказваюць пра першыя заняткі ў БДУ, канферэнцыі, экзамены, цырымонію пасвячэння ў студэнты, уручэнне дыпломаў, жыццё студэнцкай моладзі па-за вучэбнымі заняткамі. Архіў тэматычна падзелены на тры катэгорыі: «Мерапрыемствы», «Аб'екты» і «Персаналіі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## Извещение о проведении «21» февраля 2017 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк»

Сведения о продаваемом имуществе:

| Номер предмета торгов | Информация об имуществе | Площадь, кв. м | Начальная цена, руб. с НДС | Размер задатка, руб. с НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение здание блока гаражей инв.№443/С-16865, по адресу: Гродненская обл., Сморгонский р-н, г. Сморгонь, ул. Октябрьская. Земельный участок кадастровый №425650100001004837 площадью 0,0432 га; назначение участка – Земельный участок для обслуживания блока гаражей | 200,6 | 24 410,60 | 2 441,06 |

**Продавец имущества:** Открытое акционерное общество «Белагропромбанк», 220036, г. Минск, пр. Жукова, 3.

**Организатор торгов:** Консалтинговое унитарное предприятие «Агробизнесконсалт», 220123, г. Минск, ул. В. Хоружей, 22, оф.1703.

Торги проводятся в форме аукциона в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и условиями проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белагропромбанк».

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет Консалтингового унитарного предприятия «Агробизнесконсалт» №3012201310011 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, код 153001964, УНП 190982374 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в условиях проведения торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

**Торги проводятся «21» февраля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Сморгонь, ул. Советская, 25**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 19.01.2017 по 17.02.2017 включительно в рабочие дни с 08.30 до 12.30 и с 13.15 до 17.30 (по пятницам – до 16.15) по адресу: г. Минск, ул. В. Хоружей, 22-1703.

Получить дополнительную информацию и ознакомиться с документацией по условиям и предметам торгов можно на сайте www.torgi.agroconsult.by

Телефоны для справок: филиал ОАО «Белагропромбанк» – Гродненское областное управление Начальник отдела обеспечения деятельности банка Трусило Ян Станиславович, тел. 8 (0152) 79 51 20.

Организатор аукциона:

тел./факс 8 (017) 399 66 39, GSM VEL 8 (029) 816-64-46, GSM MTS 8 (044) 540-64-46.

## Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома объявляет о проведении повторных публичных торгов по реализации имущества, принадлежащего ООО «БелГрандсСтрой»

Лот №1. Автомобиль MERCEDES-BENZ ML320 2006 года выпуска, номер кузова WDC1641221F073175.

Примечание: имущество является предметом залога.

**Стоимость 16 487 белорусских рублей 80 копеек.**

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

**Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://just-minsk.gov.by/,**

а также в помещении отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Мингорисполкома: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.

**Торги состоятся 03.02.2017 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3, каб. 204.**

**По вопросам проведения и участия в торгах следует обращаться к: судебному исполнителю Русецкому Алексею Павловичу, т./ф. (017) 200-12-93, +375-44-529-25-11 начальнику отдела Шмарловской Ирине Владимировне, т. 200-13-48 +375-44-529-25-01 с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 или по адресу: г. Минск, ул. Коллекторная, 3.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900002445 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 100223493 отдела принудительного исполнения УПИ ГУЮ Мингорисполкома не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. №232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 2** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Автомобиль МАЗ 5337А2-341, 2008 г. в., № рамы (VIN) Y3M5337A280000767, кузов грузовой специальный цистерна, цвет – белый, формула 4*2, полная масса 18 000, двигатель – дизельный 6-цилиндровый 11150 $см^3$ 169kw 230 л.с., ЯМЗ-236НЕ-2, пробег 256351 км |
| Начальная цена продажи | 11 469,30 р. (одиннадцать тысяч четыреста шестьдесят девять рублей тридцать копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 1 146 р. (одна тысяча сто сорок шесть рублей) |
| Условия аукциона | Без условий |
| Продавец | ОАО «Лиданефтепродукт», 231300, г. Лида, пр-т Победы, 127, 8-0154-550-808 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| Условия оплаты | 100% предоплата за приобретаемый объект |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 31 января 2017 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звезда» 19.10.2016 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений – 26 января 2017 г. до 15.00**

**Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/**

## ДОПОЛНЕНИЕ И ИЗМЕНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ

**по объекту «Реконструкция застройки территории в районе ул.Михалово, Алибегова.» Жилой дом № 9 по генплану»,**

опубликованной в газете «Звезда» № 90 (28200) от 14.05.2016

Дополнительно для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для юридических лиц и граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагается 49 (сорок девять) квартир, без выполнения внутренних отделочных работ, в том числе:

- 31 (тридцать одна) 1-комнатная общей площадью от 40,33 до 40,6 кв. м стоимостью строительства за 1 (один) кв.м. общей площади в размере, эквивалентном **970 долларам США**;
- 18 (восемнадцать) 2-комнатных общей площадью от 61,63 до 61,76 кв. м стоимостью строительства за 1 (один) кв. м общей площади в размере, эквивалентном **950 долларам США**.

**Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 30% стоимости объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма – в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 3 (трех) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве аннулируется и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

В коммунальную собственность г. Минска для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство, безвозмездно передается 12 квартир общей площадью 760,8 кв. м.

**Для заключения договоров необходимы:**

- паспорт и личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор.

Документы для заключения договоров будут приниматься **с 24.01.2017 по адресу: г. Минск, ул. Сергея Есенина, д. 4, офис 107, каб. 1, тел.: (017)234-16-98, (044)795-44-44.**

УНП 192400611

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Бобруйсктранс», г. Бобруйск, ул. Минская, 123 |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Изолированное помещение | Помещение транспортного назначения | 189,3 | 710/D-66332 | Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, 123 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке:** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000005001187 пл. 5,3080 га, расположенный по адресу: г. Бобруйск, ул. Минская, 123 – предоставлен в общую долевую аренду до 05.11.2112 г. Покупателю после приобретения предмета аукциона будет оформлена доля в праве аренды на общий земельный участок согласно Законодательству Республики Беларусь |

**Начальная цена без учета НДС – 8 960,00 бел. руб. (BYN)**

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | в течение **20** рабочих дней после проведения аукциона. |

**Условия оплаты предмета аукциона**

1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%, который Покупателю необходимо перечислить на р/с ГУ МФ Республики Беларусь по Могилевской области №3602917010008 в ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 795, УНП 700005949, назначение платежа 01001 за ОАО «Бобруйсктранс», УНП 700169542.

2. Денежные средства, причитающиеся от реализации объектов без учета НДС, перечисляются на счет ОАО «Бобруйсктранс» № 3012259270039 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458, УНП 700169542.

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **20.02.2017** в 11.00 **по адресу: г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97, пом. 205, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **17.02.2017** до 17.00 **по адресу: г. Бобруйск, ул. Социалистическая, д. 97, пом. 205, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 225-72-00-38; +375 29-662-86-96. Email: auction@cpo.by** |

## Извещение о проведении 02 февраля 2017 года повторных торгов

с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга

### «БЕЛАВТОМАЗ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)

| № | Наименование | Инв. номер | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Зуборезный п/автомат 5С280П, год выпуска – 1980 | 4220623 | г. Минск, ул. Социалистическая, 2 | 12 296,78 | 1 220,00 |

Продавец имущества – ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся 02 февраля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляется с 19.01.2017 по 31.01.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 217-96-37 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

■ Не нашкодзь!

# ЗА КУПАННЕМ — ПНЕЎМАНІЯ

**Пасля вадохрышчанскіх свят павялічваецца колькасць выклікаў хуткай дапамогі і зваротаў у амбулаторную службу. Медыкі выяўляюць не толькі вірусныя рэспіраторныя захворванні, але і пнеўманіі. Праўда, яшчэ ніводзін такі хворы не звязаў гэта з купаннем у палонцы — кожны пераканаwны, што захворванне было яшчэ да таго.**

У арганізацыі аховы здароўя Мінска з 9 снежня звярнулася 1200 чалавек, у тым ліку 61 дзіця, пацярпелых ад халадовай або галалёднай траўмы. Шпіталізавана 230 чалавек. Па краіне ад пераахаладжэння з пачатку зімы загінулі 47 чалавек, з іх 22 — сёлета ў студзені.

— Абсалютная большасць такіх здарэнняў, у тым ліку зімой на вадзе, адбываюцца на добрым падпітку, — адзначае **старшыня Таварыства ратавання на водах Фёдар КЛЮКАЧ.** — Калі вы рыбак і выходзіце на лёд зімой, значыць, павінны азнаёміцца на сайце нашай арганізацыі з правіламі паводзін. Абавязкова павінна быць ратавальная камізэлька — незалежна ад таўшчыні лёду, а таксама некаторыя прылады, што дапамогуць зачапіцца за лёд у выпадку падання ў ваду. Вас чакаюць дома і без улову — так мы кажам у нашай службе. З другога боку, усе мы павінны ведаць, што на ратаванне чалавека, які праваліўся пад лёд, у нас ёсць усяго 15—20 хвілін.

Гэтымі днямі ў сталіцы запланавана правядзенне 2-га рэспубліканскага фестывалю здаровага ладу жыцця «Вадохрышчанскія купанні» і 2-га спартыўнага чэмпіянату спартыўнага плавання, на які запісаліся ўжо больш як 200 удзельнікаў з Беларусі, Польшчы, Латвіі, Эстоніі, Бельгіі, Украіны, Расіі і іншых краін. Праходзіць апошняе мерапрыемства будзе на базе ратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» 20—21 студзеня.

**Злоўжыванне алкаголем для саграванія недапушчальнае, у тым ліку падчас купання ў ледзяной вадзе.**

Па традыцыі каля спецыяльна арганізаваных палонак на Вадохрышча будуць дзяжурыць брыгады меддапамогі. Арганізавана аказанне меддапамогі на ўсіх ратавальных станцыях, а таксама на Камсамольскім возеры.

— Пераахаладжэнне мае дачыненне да агульнага стану арганізма, абмаражэнне — мясцовае пашкоджанне тканак, — тлумачыць **галоўны спецыяліст аддзела пярвічнай медыцынскай дапамогі галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Алена САЎКО**. — Працяглае знаходжанне нават пры тэмпературы паветра -10 градусаў, але пры моцным ветры і высокай вільготнасці пагражае хуткім пераахаладжэннем і абмаражэннем нароўні з больш нізкімі тэмпературамі. Калі тэмпература нашага цела ўпадзе да 25 градусаў, мы загінем. Асабліва пільна трэба сачыць за дзецьмі. Гуляючы на вуліцы зімой, яны павінны праз кожныя 15—20 хвілін вяртацца дадому і саграваццa цёплым (толькі не гарачым!) напоем, напрыклад, чаем.

### САГРАВАЙЦЕСЯ ПАВОЛЬНА

• Апранайцеся па надвор'і. Пажадана шматслойна, з абавязковай абаронай вушэй, шыі, рук і ног. Калі адчуваеце, што падмарозілі ногі, ні ў якім разе не здымайце абутак, каб расцерці іх. Вядомы выпадкі, калі людзі дапускалі такую памылку, аднак у выніку хуткага развіцця ацёку надзець абутак назад не здолелі, што скончылася працяглым лячэннем і інваліднасцю.

• Першая дапамога пры абмаражэнні будзе заключацца ў тым, каб паступова сагрэцца. Любое агрэсіўнае ўздзеянне, кшталту актыўнага расцірання або гарачай ванны — пад забаронай. Усё гэта яшчэ больш траўмуе і без таго пацярпелыя тканкі. Галоўнае — ухутацца ў цёплыя рэчы і павольна піць што-небудзь цёплае. Можна прыняць і ванну, але тэмпературу вады ў ёй трэба паступова падымаць з 18 да 37 градусаў.

• Часу на падрыхтоўку да купання ў ледзяной вадзе ўжо не засталося. Калі вы навічок і вас сапраўды хвалюе здароўе, то сёлета лепей ім не рызыкаваць. Спачатку трэба стаць прыхільнікам здаровага ладу жыцця, займацца загартоўкай штодня з дапамогай кантраснага душа, абліваннаў паводле спецыяльных рэкамендацый.

• Не акунайце ў ледзяную ваду дзяцей. Устрымайцеся ад працэдур, калі ў вас ёсць хранічныя захворванні — сардэчна-сасудзістыя або іншыя, калі нядаўна перанеслі аперытыўнае ўмяшанне.

Злоўжыванне алкаголем для саграванія недапушчальнае, у тым ліку падчас купання ў ледзяной вадзе. Пасля ўжывання алкаголю ўзмацняецца цеплааддача, зніжаецца крытычнае асэнсаванне нашага стану і прапускаецца момант своечасовага звароту па меддапамогу.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

## КАЛІ МАРОЗ — У ДАПАМОГУ

**З надыходам халадоў усе лясгасы пачалі актыўную распрацоўку цяжкадаступных участкаў на бураломах у Смалявіцкім і Чэрвеньскім раёнах.**

Як расказалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, на пачатак месяца на цяжкадаступных участках лесафонду, пашкоджаных ляснымі ўраганамі, засталіся нераспрацаванымі амаль 86 тысяч кубаметраў драўніны. Уся яна знаходзіцца на пераўвільготненых мясцінах, куды практычна немагчыма даставіць тэхніку. А нізкія адмоўныя тэмпературы дазволілі лясгасам зайсці ў гэтыя балоты, каб распачаць разборку буралому і вывазку нарыхтаванай драўніны.

У міністэрстве нядаўна прайшло экстранная пасяджэнне штаба па ліквідацыі наступстваў ураганаў, на якім кіраўнік галіны паставіў задачу не ўпусціць спрыяльныя ўмовы надвор'я і завяршыць распрацоўку цяжкадаступных участкаў у максімальна сціслыя тэрміны — да 1 лютага. Вываз і рэалізацыя ўсёй драўніны павінны быць завершаны да 1 красавіка.

## БРАКАНЬЕР-«КУЛІБІН»

### сабраў гібрыд зброі з розных узораў

**Стрэлы ў лесе каля вёскі Вілы прыцягнулі ўвагу работнікаў Лепельскай міжрайінспекцыі: дзяржінспектары ведалі, што гэтыя ўгоддзі не адносяцца ні да адной паляўнічай гаспадаркі, адпаведна, паляванне там праводзілася незаконна.**

Стралком быў 30-гадовы мінчанін, ураджэнец гэтых мясцін, расказалі ў Дзяржінспекцыі. Пры затрыманні мужчына паспрабаваў збегчы, пры гэтым часткі сваёй зброі ён раскідаў у розныя бакі. Калі іх сабралі разам, дзяржінспектары былі нямала здзіўленыя. Прыклад зброі быў ад гладкаствольнай стрэльбы, а ствол — ад нарэзной. Да саматужнага «гібрыда» нелегал дадаў оптыку, а страляў патронамі калібру 7,62 міліметра — ад аўтамата Калашнікава. Зброю накіравалі на экспертызу. За нелегальнае паляванне мінчаніну пагражае штраф да 50 базавых велічынь, а за незаконныя дзеянні ў адносінах да агнястрэльнай зброі можа быць заведзена крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Вакол нас

# САЛАВЕЙ «ПРЫЗЯМЛІЎСЯ» Ў СЛУЦКУ, ЗІМАРОДАК — У ВАЛОЖЫНЕ

## На Міншчыне з'явіцца трэці крылаты сімвал

**На Мядзельшчыне талакой выбіраюць птушку — сімвал Нарачанскага краю. На пачэсную ролю прэтэндуюць лебедзь-шыпун, шызая чайка і палявы жаўрук. Пасля падвядзення вынікаў грамадскага абмеркавання будзе названы пераможца. Яго выявы з'явяцца на будынках Мядзела, на сувенірах.**

Упершыню птушыны сімвал з'явіўся ў Мінскай вобласці ў Слуцку. Ім стаў салавей, занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі ў 1981 годзе. Яго колькасць у краіне налічвае 3000—6000 пар. Па выніках анкетавання случане прапаноўвалі ў якасці сімвала 43 віды птушак. Але менавіта салавей набраў найбольшую колькасць галасоў. І гэтаму ёсць тлумачэнне. Штогод на Случчыне праводзіцца кампанія «Салаўіныя ночы», у выніку якой падлічваецца колькасць гэтых певуноў у горадзе і раёне. Як паказваюць даследаванні, тут на кожны гектар тэрыторыі салаўёў больш, чым у іншых раёнах вобласці. Драўляная малая архітэктурная форма, прысвечаная гэтаму невялікаму птаху, адкрыта ў двары Эколага-біялагічнага цэнтра. Кампазіцыя ўяўляе сабой дрэва, у аснове якога размешчана птушынае гняздо, а на вяршыні — пеўчы салавей. Вышыня знака — 2,5 метра. Аўтар — мясцовы скульптар Алег Шапель.

У гэтым жа цэнтры створаны і адзіны ў краіне музей салаўя. У яго экспазіцыі статуэткі, малюнкі, вырабы, падборкі вершаў і кніг, песень, прысвечаных гэтай птушцы. Збор экспанатаў працягваецца.

А летась свой прыродны сімвал займеў і Валожын. Ім стаў зімародак. Зімародак — візітная картка Валожыншчыны. У Налібоцкай пушчы гняздуецца каля 40 пар гэтай птушкі: самая вялікая папуляцыя ў Беларусі. Зімародак занесены ў Чырвоную кнігу.


Салавей — сімвал Слуцка.



У яго гонар устаноўлена скульптура вышынёй 2 метры 12 сантыметраў. Гэта твор скульптараў Юрыя Бірына-Паўлава і Лаймэ Міронччык. Зімародак «прызямліўся» ў парку з невялікай сажалкай. Абранае месца максімальна набліжана да прыродных умоў гнездавання — каля вады, у зялёных зонах. Акрамя таго, дзве дамы ў райцэнтры ўпрыгожылі графіці гэтай яркай птушкі. Яе выява з'явілася і на будынку паліклінікі ў горадзе Івянец Валожынскага раёна. Аздобіў фасад мастак мінскай арт-студыі TAKTAK Алесь **KONTRA**. Паліклініка месціцца амаль у цэнтры горада і каля яе штодзень праходзіць шмат гараджан, гасцей і турыстаў, якія любуюцца творам.


Гэта твор скульптараў Юрыя Бірына-Паўлава і Лаймэ Міронччык.

Магчыма, за Мядзельскім, Слуцкім і Валожынскім раёнамі сваю птушку шчасця пачнуць выбіраць і іншыя рэгіёны Міншчыны. Птушка-сімвал дасць магчымасць набыць імідж, займець турыстычны брэнд, паказаць прыгажосць і непаўторнасць краю і зберагчы папуляцыю пярнатых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

### 19 СТУДЗЕНЯ

**1802** год — нарадзіўся (мястэчка Капаткевічы, цяпер у Петрыкаўскім раёне) Іпаліт Клімашэўскі, літаратар, педагог, удзельнік паўстання 1830-1831 гадоў. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. Падтрымліваў цесныя адносіны з Т. Занам, А. Міцкевічам. Пісаў вершы, песні, артыкулы. У 1830 годзе выдаў «Літоўскі каляндар на 1831 год», у якім апублікаваў фрагмент Хронікі Быхаўца з апісаннем забойства вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча. У час паўстання 1830-1831 гадоў быў камандзірам атрада, які ўваходзіў у легіён, сфарміраваны са студэнцкай моладзі. Удзельнічаў у сутыкненнях пад Руднікамі, паранены трапіў у палон. Быў у ссылцы. У 1832 годзе збег за мяжу, у Парыж. Рэдагаваў сатырычныя часопісы, якія выдаваліся ў Парыжы і Версалі. Напісаў успаміны, рукапіс якіх згарэў у Варшаве ў Другую сусветную вайну. Памёр у 1874 годзе.

**1839** год — нарадзіўся Поль Сезан, французскі мастак-постімпрэсіяніст.

**1939** год — нарадзілася (в. Шпакоўшчына Смалявіцкага раёна) Таццяна Рыгораўна Мархель, актрыса, народная артыстка Беларусі. Працавала ў Гродзенскім і Магілёўскім абласных драматычных тэатрах, Беларускім тэатры імя Я. Коласа, Тэатры-студыі кінаакцёра, Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі. Характарная актрыса. Выканаўца беларускіх народных песень у спектаклі «Сымон-музыка», тэлеспектаклі «Новая зямля». Знялася ў кінафільмах «Людзі на балоце», «Подых навальніцы», «Анастасія Слуцкая» і іншых.



**1952** год — дзень нараджэння вядомага беларускага вучонага-эканаміста, доктара эканамічных навук, прафесара Ірыны Васілеўны Новікавай. Аўтар навуковых прац па праблемах глабалізацыі сусветнай эканомікі і тэндэнцыях сусветнага сацыяльна-эканамічнага развіцця, сучаснай трансфармацыі нацыянальных эканомік, сістэмнай метадалогіі ў эканамічных даследаваннях.

**1955** год — прэзідэнт ЗША Д. Эйзенхаўэр правёў першую ў свеце тэлевізійную прэс-канферэнцыю. Хоць амерыканскія прэзідэнты адказвалі на пытанні прадстаўнікоў прэсы на прэс-канферэнцыях з 1913 года, першапачаткова падобныя мерапрыемствы былі «не для друку». Яны перайшлі на прынцып «для друку» і сталі адкрытымі для тэлебачання менавіта з 19 студзеня 1955 года. 33-хвілінная прэс-канферэнцыя была адрэдагавана тэлевізіёншчыкамі, у выніку скараціўшыся да 28 хвілін.

Было сказана

**Алесь БАЧЫЛА, паэт:**
*«Дзе памерла сумленне — дабру не прабіцца».*



■ Нефармат

# НЕ СПЯШАЙСЯ СПАЛЬВАЦЬ МАСТЫ

Анекдот, прачытаны ў нашай газеце: « — Што азначае выраз «спальваць масты»? — Ну, напрыклад, гэта калі ты адкрыў бутэльку ў паўтара літра піва, корак выкінуў...» Забаўна, ды апісаны прыклад, несумненна, можа служыць тлумачэннем фразеалагізма, тлумачэннем самага бестурботнага кшталту. Але ёсць у гэтым шэрагу надрыўна-драматычныя гісторыі, сустракаюцца і камедыйна-сатырычныя, хоць ты кінастужку здымай.

Драматычным я б назвала няўдалае каханне Марыны, сваячкі маёй блізкай сяброўкі. Яе я раней не ведала, сустрэліся ў бальніцы, калі абедзве ў адзін час зайшлі праведаць Ірыну. Іра потым і расказала пра бяду сваёй прыяцелькі-сваячкі, якую называе ахвярай жаночых раманаў. Тая, і праўда, глытае творы маскульту партыямі, падчытвае глянцавыя часопісы. З самых юных гадоў дзяўчына жыла ў нейкім рамантычным, напалову выдуманым свеце. І ўсё чакала свайго героя. Але герой пазніўся, гады ішлі. Марына выйшла замуж за ціхага сціплага хлопца, нарадзіла дачку. Родныя і блізкія ўздыхнулі з палёгкай. Усё было б, можа, добра і далей, каб аднойчы нячысцік не прынёс героя яе мар. Ён прыехаў у іх горад з другой краіны судзіць спартыўныя спаборніцтвы. Яна працуе адміністратарам у гасцініцы, убачыла яго і адразу пазнала. Ён быў такім, якім намалявала яго ва ўласным уяўленні шмат гадоў таму. Адным словам, раман атрымаўся імклівым і бурным. Ён паклікаў з сабой. Яна, як сумленны чалавек, адразу расказала мужу, стала збіраць рэчы.

Але ў самы апошні момант намеры «героя» памяняліся. Аб прычынах не ведае ніхто. Бо ён знік з гасцінічнага нумара разам з рэчамі, а тэлефон пакінуў, як яна маркуе, знарок. Як няцяжка здагадацца, рамантычная асоба засталася адна. Назад у сям'ю дарогі няма, бо сама ж спаліла масты. Ірына шкадуе няўдалую сваячку, кажа, што раней яна хадзіла з прычоскай а-ля Мірэй Мацье, цяпер на яе галаве штосьці накшталт прычоскі санітаркі Цёткі Валі, калі апошняя, растрапаная, з вечна незадаволеным выглядам працірае падлогу.

Падзялілася гэтым сюжэтам з калегам, які вядзе крымінальную хроніку ў іншай газеце. А ён сказаў, што ў яго па азначанай тэме гісторый цэлы воз. Адна з іх красамоўна характарызуе вясковае жыццё з усімі атрыбутамі XXI стагоддзя. Хоць яе не варта лічыць правілам, хутчэй выключэннем з сельскіх будняў. Адным словам, у вёсцы купіў дом рэспектабельны ваенны пенсіянер. І стаў не дачнікам, як цяпер робяць многія гараджане, а перабраўся на пастаяннае жыхарства. Мужчына, які нядаўна стаў удаўцом, зрабіў выбар свядома. На вясковай сядзібе заўсёды можна знайсці прымяненне рукам і энергіі, а ў горадзе гуляць у даміно з суседзямі ці шукаць кампанію каля магазіна — не яго інтарэс. Вясковым бабулькам, якіх у неперспектыўнай вёсцы засталося трое, чалавек з машынай стаў нібы знаходка. У горадзе ён бывае часта, ніколі, напрыклад, не адмаўляў зайсці ў аптэку, у краму, калі ў каго з аднавяскоўцаў здаралася патрэба. А ў выхадныя часам сваіх суседак у царкву падвозіў і назад забіраў. Ну, і на экстранную дапамогу па гаспадарцы, дзе патрабуецца мужчынская сіла, вясковыя жыхаркі маглі заўсёды разлічваць. Жылі яны так ужо не адзін год.

Ды аднойчы да весніц суседа пад'ехала нетутэйшая дарагая іншамарка. З салона выскачыла зноў жа нетутэйшая прыгажуня, гаспадар жа нешта перадаў кіроўцу, а госцю павёў у дом. Бабулькі за ўсім гэтым сачылі ўважліва і зрабілі свае высновы. Яны ж серыялы, а таксама перадачы кшталту «Скандалы, інтрыгі, расследаванні» глядзяць спраўна, таму ў курсе тэмы, якая ў тэлевізары называецца «дзяўчына па выкліку». Пільныя суседкі былога вайскоўца палічылі сваім абавязкам адразу ж патэлефанаваць участковаму. Той, вядома, па выкліку прыбыў, але ж здарыўся канфуз. Бо ніякіх рэальных доказаў крымінальнага бізнесу атрымаць не ўдалося. Любы чалавек у сваім доме можа прымаць якога заўгодна госця, што нельга расцэньваць як парушэнне закона.

Цяпер, як няцяжка здагадацца, у бабулек засталася адна забава — тэлевізар. А сусед спыніў усялякія стасункі з імі, і няма на каго паспадзявацца нават у выпадку якой надзвычайнай сітуацыі. Няхай яны абыходзяць бокам тую невялікую вёску.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by* ■

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.15 | 17.26 | 8.11 |
| Віцебск — | 9.11 | 17.10 | 7.59 |
| Магілёў — | 9.06 | 17.16 | 8.10 |
| Гомель — | 8.55 | 17.20 | 8.25 |
| Гродна — | 9.30 | 17.42 | 8.12 |
| Брэст — | 9.23 | 17.50 | 8.27 |

### Месяц

***Апошняя квадра 20 студзеня. Месяц у сузор'і Шаляў.***

### Імяніны

***Пр.*** *ВАДОХРЫШЧА (Багаяўленне — Хрышчэнне Гасподняе).* ***К.*** *Марты, Сары, Браніслава, Генрыха, Юзафа.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

## ЗАЎТРА




Ягўгена ПЯСЕЦКАГА ФОТА СЛОВА

***Гаючую ваду дорыць людзям Вадохрышча. Але не толькі са студзеньскімі днямі звязаная жыццядайная плынь крыніц, рэк, азёр. Гартаючы старонкі свайго фотаархіва, я знайшоў шмат таму прыкладаў. Здымкі сведчаць, што на розных шыротах планеты з аднолькавай вераю і спадзяваннем прыходзяць людзі і да праслаўленай ракі Іардан, дзе быў ахрышчаны Збавіцель, і да маленькіх, малавядомых лясных крынічак. На адным здымку вы бачыце бераг той самай ракі Іардан, куды прыязджаюць вернікі з усіх кантынентаў, каб прыняць хрышчэнне. На другім — каскад крыніц у Быхаўскім раёне, якія названыя вернікамі святымі і знаходзяцца пад аховай дзяржавы.***

# Ацалі нас і захавай



*У расінках бачу неба, знічкі,*
*Тое ж неба — ў люстрах рэк шырокіх.*
*Акіяны — гэткія ж крынічкі,*
*Толькі берагі ляжаць далёка.*

*Пад Навагрудкам ручай спявае*
*Тое, што пад Рымам ці Масквою.*
*Ўся планета смагу наталяе*
*Жыццядайнай, вечнаю вадою.*

*Ад часоў стварэння так вядзецца:*
*Ў повязі Зямля і ўсе зямляне.*
*Хваля Іардана калыхнецца —*
*Адгукнуцца прыпяцкія хвалі.*

*Хвалі Іардана боль прагоняць,*
*І надзеі вернуць чалавеку...*
*Мне ўсё гэта бацька Нёман дорыць,*
*Як дзядам маім дарыў спрадвеку.*



■ Філатэліст

# ДА ЮБІЛЕЮ СЯБРОЎСТВА

**Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь 20 студзеня выпускае ў абарачэнне паштовую марку да 25-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай.**




Развіццё гэтых адносін — прыярытэтны кірунак знешняй палітыкі Беларусі. Краіны рэгулярна абменьваюцца візітамі на вышэйшым узроўні, вядуць актыўны міжпарламенцкі дыялог, дынамічна развіваюць міжведамасныя кантакты.

Намінал маркі Н адпавядае тарыфу на перасылку міжнародны простай пісьмовай карэспандэнцыі (пісьмаў, бандэроляў, дробных пакетаў) масай да 20 г, не прыярытэтнай.

У дзень выпуску паштовай маркі на паштамце Мінска і ў Пекіне будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень» ■

## УСМІХНЕМСЯ

— Ды хто мы такія, каб супрацьстаяць сілам прыроды?! Так, парушынкі на ўскраіне Сусвету...

— Пятровіч, гад, бяры рыдлёўку і прыбірай снег!

**Тры стадыі развіцця мужчыны:**
**1. «Агу» — немаўля.**
**2. «Ага» — падлетак.**
**3. «Угу» — муж.**

Настаўніца — маці вучня:

— Вовачка вельмі здольны хлопчык, але занадта шмат думае пра дзяўчынак! Гэта адцягвае яго ад па-сапраўднаму важных спраў.

Маці:

— Абавязкова паведаміце, калі знойдзеце рашэнне! У яго таты такая ж праблема...

**Нішто так не марнуе час, як кілаграм семак.**

— Прафесар, чаму вы нічога не паставілі мне ў залікоўку?!

— Ды таму, што вы ў яе нічога не паклалі!

**На амерыканскіх хлапечніках дзяўчына выскоквае з торта тады, калі страляе хлапушка.**

**...На нашых — тады, калі пачынаюць рэзаць торт.**



Малюнак Андрэя СЛУЦКАГА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 263.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 18 студзеня 2017 года.